№ 15 (373) 16 красавіка 2004

www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Хто там падрастае ў цені Лукашэнкі?

Беларуская палітыка перабывае ў стане зацьменьня. Адзін зацьміў усіх. «Хто замест Яго?» — пытаюцца стары і малы, разважаючы пра наступныя выбары. Напэўна ж, гэта будзе супрацьлегласьць яму. Стрыманы, ня схільны да крайнасьцяў, неканфліктны, культурны, а галоўнае, прафэсійны. І малады. Заўтра, а асабліва пасьлязаўтра беларускае палітыкі будуць вызначаць прафэсіяналы. Хто там падрастае ў цені Лукашэнкі? Пакаленьне «NEXT».

старонка 4

Сьвіней у школы

Вэртыкаль прыдумала занятак для настаўнікаў.

старонка 3

Акуратнае таптаньне на месцы

«І жанчынаў ня менш за 30 працэнтаў». Пасланьне Аляксандра Лукашэнкі да нацыянальнага сходу.

старонка 2

Бунт супраць Шэймана

«Чаму адзін зь лідэраў рынку мінэральнай вады павінен даваць хабар, каб мець магчымасьць прадаваць уласны тавар?» — абураўся дэпутат Дзялендзік.

старонка 6

Ці трэба Беларусі ўступаць у Эўразьвяз

ЭЗ будзе заахвочваць усходніх суседзяў да «мяккага сяброўства».

старонка 5

Канцэрт году

Найбуйнейшая рок-акцыя будзе доўжыцца чатыры гадзіны і зьбярэ дваццаць гуртоў. Агульная магутнасьць апаратуры — 30 кіляватаў. Такім гукам можна зруйнаваць невялікі ДК.

старонка 9

Сьветлыя–сьветлыя

Нашы памерлыя сустрэнуцца з намі на Радаўніцу. Старонка 13.

Кубак Дэвіса. Старонка 11.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Лаві, Амэрыка!

Сьвяты Васіль Богам Дадзены

Створаны праект помніка Быкаву. **Старонка 13**.

У Вялейцы ўсё па калейцы

У Доме культуры ў красавіку чакаюцца дзьве вялікія падзеі: прыезд «Песьняроў» і тэатру «Хрыстафор», які сьвяткуе сваё 15-годзьдзе турам па краіне. З усёй краіны — **старонка 7.**

Ула: містычнае апавяданьне

«Сны праўдзяць», — упэўнена гавораць старыя людзі менавіта пра такія сны, бо на схіле веку адгадкі ўжо засьпелі іх: кожнага свае і кожнага — зьнянацку. Містычнае апавяданьне Ўладзімера Лобача на **старонцы 15.**

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта абыдзецца нашмат таньней, чым купляць ураздроб.

Дык падпісвайся!

Японец Кляшчук

Будучы сутворцам беларускага краявіду-клішэ, які ня зблытаеш з краявідамі ніякай іншай краіны, умеючы выяўляць яго бясконца і неманатонна (як Шагал — свае мястэчкі), фатограф Кляшчук застаўся пры гэтым гурманам краявіду для абраных, краявіду-архідэі, які цьвіце некалькі гадзін у год і не заўжды добра пахне. **Старонка 8.**

Акуратнае таптаньне на месцы

Пасланьне Аляксандра Лукашэнкі да нацыянальнага сходу

«Павінны быць прадстаўлены і вэтэраны, і моладзь, і жанчыны — ня менш за 30—40%. Я буду падтрымліваць тэндэнцыю на большую прысутнасьць жанчынаў», — даў установку на склад новага парлямэнту Аляксандар Лукашэнка. «Трэба быць прыгожымі і здаровымі людзьмі, — казаў ён, — і такімі нас можа зрабіць толькі спорт, тым больш што гэты год — год летніх Алімпійскіх гульняў».



Па сваіх ідэях сёлетняе пасланьне ня надта розьнілася ад мінулагодніх. Аднак зьмянілася танальнасьць. На гэты раз Лукашэнка быў стрыманым у ацэнках, пільней сачыў за сваёй мовай, ахвотна цытаваў па-беларуску і скіроўваў «мэсыдж» да больш адукаваных слаёў электарату, чым у мінулыя гады.

Замежнапалітычную частку выступу распачыналі адносіны з Эўразьвязам, а не канфлікты з Расеяй. Краіны «Злучаных Штатаў Эўропы», як ён выказаўся, Лукашэнка ці то паўшчуваў, ці то пахваліў за скаардынаваную замежную палітыку. Асноўным дасягненьнем Беларусі ён назваў зьніжэньне залежнасьці ад экспарту ў Расею. Прычым, як раней ён не абыходзіўся безь перабольшваньня вынікаў інтэграцыі, цяпер ён быў шчодрым у апісаньні посьпехаў дэзінтэграцыі. Ён прыпісаў свайму кіраваньню заслугу зьніжэньня расейскае долі ў беларускім экспарце з 85% да паловы. Між тым, на самай справе доля экспарту ў Расею ніколі й не падымалася вышэй за 60%.

Маскве ён параіў «не глядзець на Беларусь праз прыцэл газавай трубы». Дывэрсыфікацыю крыніцаў энэрганосьбітаў назваў прыярытэтнай задачай ураду. Рэфэрэндум аб Канстытуцыйным акце быў названы непатрэбным, а адзіны рубель — магчымым толькі ў якасьці «вянца» ў даўгабудзе супольнай дзяржавы.

Лукашэнка зноў выказаў нэгатыўнае стаўленьне да NATO. Беларускае войска, заявіў ён, павінна быць у стане нанесьці непрымальныя страты любому патэнцыйнаму агрэсару.

Пра замежную палітыку ў пасланьні гаварылася няшмат. Куды больш часу было аддадзена спорту. Краіна дазналася, з чаго пачынаюцца даклады міністра замежных справаў прэзыдэнту: з тэнісу. «Трэба быць прыгожымі і здаровымі людзьмі, і такімі нас можа зрабіць толькі спорт, тым больш што гэты год — год летніх Алімпійскіх гульняў», — агітаваў прэзыдэнт. І няўклюдна апраўдваўся за незразуметыя насельніцтвам лядовыя палацы: «Яны цалкам акупаюцца». Міністар унутраных справаў і старшыня хакейнай фэдэрацыі па пакліканьні Навумаў пры кожным упамінаньні пра палацы ўскокваў зь месца і ўставаў навыцяжку.

У мэтах павышэньня культуры і ўмацаваньня дысцыпліны прэзыдэнт даў канкрэтныя ўказаньні ўладам на месцах аб тым, якімі мэтадамі трэба змагацца з самагоншчыкамі і выпівохамі, зганіў практыку дакладаў прэзыдэнту пра колькасьць сканфіскаваных самагонных апаратаў, загадаў зьнізіць заробкі на нафтаправодзе «Дружба» і вызначыў прыкладны кошт пабудовы вясковых дамоў: 15—18 тысяч, яўна не ў нацыянальнай валюце. «Ідзеце ад жыцьця!» — паўтараў ён.

Ён паабяцаў давесьці сярэдні заробак да 190—200 даляраў пад канец гэтага году. А інфляцыя якая? «Можа быць, 13%. Госпад казаў: трынаццаць — самая харошая лічба. Вось да яе і трэба імкнуцца».

Культура і чысьціня — вось што патрэбна Беларусі, працягваў Лукашэнка: «акуратнасьць, дакладнасьць і дзелавітасьць» — гэта якраз якасьці «і беларускага народу». Такім чынам, маем новы арыенцір — Нямеччыну. Пабудова грамадзянскае супольнасьці зьверху: кожны кіраўнік мусіць браць сабе грамадзкую нагрузку. «Вось як я», — у Алімпійскім камітэце.

Міністарка аховы здароўя Пастаялка слухала пасланьне на пачэсным месцы ў першым радзе, поплеч з кіраўніком прафсаюзаў Козікам, пакінуўшы далёка ззаду сілавых міністраў.

Дэмакратызацыя і парлямэнцкія выбары? І тут нічога новага. Лукашэнка паабяцаў не чыніць перашкодаў апазыцыі, забясьпечыць доступ да СМІ, не задзейнічаць адміністрацыйнага рэсурсу. І тут жа адмовіўся ўносіць зьмены ў Выбарчы кодэкс, якіх патрабуюць партыі і замежжа. На думку Лукашэнкі, у новай палаце «павінны быць прадстаўлены і вэтэраны, і моладзь, і жанчыны — ня менш за 30—40%. Я буду падтрымліваць тэндэнцыю на большую прысутнасьць жанчынаў». Цікава, як мясцовыя ўлады, да якіх ён зьвяртаўся, могуць выканаць такое патрабаваньне, не парушаючы закону і ня чынячы перашкодаў іншым кандыдатам.

Свая квота паабяцаная і «адказнай апазыцыі». Лукашэнка прызнаўся, што будзе вітаць абраньне Абрамавай і Канаплёва. З Парфяновічам — «пагаджуся», дадаў ён пасьля паўзы.

У часе выступу Лукашэнка ня раз папраўляў непаслухмяны левы вус і па-сталінску закладаў руку за борт пінжака.

Кіраўнік дзяржавы не абыходзіў выклікаў сёньняшняга дня — ад дывэрсыфікацыі энэргапаставак да масавай эміграцыі маладых навукоўцаў, але не прапанаваў новых адказаў на іх. Краіне па-ранейшаму прапануецца карпаратыўны аўтарытарызм мусалініеўскага ўзору з культам усюдыіснага правадыра, адзінай ідэалёгіяй, дэкаратыўнаквотнай дэмакратыяй і моцным умяшаньнем дзяржавы ў кожную сфэру жыцьця.

Барыс Тумар

ЦЫТАТА

Старшыня Гомельскага абласнога савету дэпутатаў Валер Сяліцкі:

«Мы марнуем вялікія грошы на вытворчасьць сельгаспрадукцыі з утрыманьнем радыеактыўных элемэнтаў, што перавышае ГДК у некалькі разоў. Трэба аддаць гэтыя грошы ў чыстыя раёны і адтуль завозіць прадукцыю ў Гомельскую вобласьць — так будзе лепей і для эканомікі, і для насельніцтва».

МБ; БелаПАН

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

Дэмарш крытыка

Кінакрытык Ала Бабкова зьняла зь сябе паўнамоцтвы чальца камісіі Дзяржрэгістру кінавідэафільмаў Міністэрства культуры, які выдае пасьведчаньні на права пракату кінафільмаў. Такое рашэньне яна прыняла на знак пратэсту супраць забароны паказу дакумэнтальнай стужкі «Доўгая дарога дадому… Рэквіем» пра Васіля Быкава.

ТВ толькі па-ўкраінску

Усе праграмы ТВ і радыё ва Ўкраіне маюць ісьці толькі па-ўкраінску, вырашыла ў сераду Нацыянальная рада ў справах ТВ і радыё. Мэханізм рэалізацыі рашэньня не паведамляецца. Цяпер па-ўкраінску вяшчаюць толькі два з шасьці нацыянальных тэлеканалаў.

СМ

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Напярэдадні выступу А.Лукашэнкі ў нацыянальным сходзе актывісты руху «Зубр» зьдзейсьнілі дзёрзкую акцыю: яны вывесілі шасьцімэтровы плякат зь лёзунгам «Ён мусіць адысьці!» ў цэнтры Менску, на мосьце над Нямігай. Расьцяжка правісела амаль дзесяць хвілінаў. Міліцыянты пасьпелі затрымаць адну зь неасьцярожных удзельніцаў акцыі.

Вы чытаеце няправільную газэту

Уважлівыя пасажыры мэтро й тэлегледачы маглі скмеціць, што ў ланцужках лягатыпаў інфармацыйных спонсараў апошніх рок-канцэртаў, што зьмяшчаюцца ўнізе афішаў і рэклямных ролікаў, зеўралі негарманічныя пустоты. Там мусіў быць лягатып «Нашай Нівы». Не было, выразалі. «Гэта няправільная газэта», — так немудрагеліста тлумачылі сваё патрабаваньне супрацоўнікі нядаўна створаных ідэалягічных аддзелаў.

Укладайце чэкі «Маёмасьць» у заводы мэталавырабаў. Па меры ўдасканаленьня працы ідэалягічнае вэртыкалі попыт на нажніцы будзе ўзрастаць.

Дом, які збудаваў Адам

Адам Глёбус. Дом. Раман-аўтапартрэт у сямейным інтэр'еры. — Менск: Логвінаў, 2004. — 144 с. 500 ас.

Ніхто так займальна ня піша пра сябе, як Адам Глёбус. Праўда, у ягоным новым рамане, што часткамі друкаваўся ў пэрыёдыцы, разьдзелу «Я» няма. Ён тут непатрэбны. Кожная з васьмі частак — «Унук», «Дачка», «Жонка», «Брат», «Баба», «Дзед», «Мама», «Тата» — высьвечвае чарговы ракурс таго «Я». Выходзіць неэнцыкляпэдычная біяграфія бяз датаў, але зь безьліччу фактаў, адчуваньняў і сюжэтаў. У якасьці стылістычнае процівагі на фарзацы зьмешчаная нататка пра аўтара зь «Беларускай энцыкляпэдыі».

Чарнобыльскі шлях'2004

Ганаровым старшынём аргкамітэту «Чарнобыльскага шляху'2004» абраны прафэсар Іван Нікітчанка. Збор удзельнікаў акцыі 26 красавіка папярэдне прызначаны на пл.Якуба Коласа а 18.30.

Працоўны тыдзень Рэдакцыі «Нашай Нівы» пачаўся зь візыту гурту юнакоў-маладафронтаўцаў зь велікоднымі падарункамі. Дзякуй, маладафронтаўцы!

Даніна памяці

17 красавіка аб 11-й грамадзкая ініцыятыва «За ўратаваньне мэмарыялу Курапаты» правядзе ва ўрочышчы талаку. Бярэце з сабой неабходнае для рамонту пашкоджаных крыжоў і ачысткі мэмарыялу ад сьмецьця і паваленых дрэваў.

Сьвіней у школы

Вэртыкаль прыдумала занятак для настаўнікаў

Вясковыя настаўнікі Крупшчыны выбіраюць каменьне на калгасным полі. Улады Баранавіцкага раёну змусілі кожнага настаўніка здаць 300 кг сена. А пераплюнуў усіх Мядзельскі раён.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Настаўніку Лабановічу з Коласавай трылёгіі і ня сьнілася жыцьцё сёньняшняга вясковага настаўніка. Ня ў прыклад колішняй «панямонскай інтэлігенцыі», якая марнела і «загнівала», сёньняшнія настаўнікі свае вольныя часіны бавяць зусім не за картамі ды гарэлкай. Яны дбаюць пра ўздым сельскай гаспадаркі.

Сёньняшні настаўнік мусіць ведаць ня толькі свой прадмет: яму край неабходныя й веды асноваў сельскай гаспадаркі. Нават у тым рэдкім разе, калі ён не трымае ўласнай каровы ці сьвіньні.

Для мясцовай улады вясковы настаўнік — усяго толькі адзін з шэрагу іншых работнікаў. Можна неяк зразумець сытуацыю, калі пэдагог — адзін зь нямногіх жыхароў вёскі. У некаторых калгасах Крупшчыны, напрыклад, настаўнікі, скончыўшы заняткі ў школе, ідуць даіць кароваў на мясцовую фэрму: болей няма каму.

Але здараецца, рабіць і «чужую» працу. «У нас настаўнікаў пасылалі прыбіраць каменьне з поля. Прычым рабіць гэта давялося ў Вербную нядзелю: ніхто асабліва не глядзеў, што сьвята. А потым даводзіцца сядзець да другой гадзіны ночы, каб падрыхтавацца да ўрокаў на наступны дзень», — наракае настаўнік А. з Крупскага раёну.

Выбіраньне бульбы наагул стала нацыянальным відам спорту. Выбіраюць бульбу гарадзкія жыхары, выворваюць яе вясковыя. Дарослыя і дзеці ўдзельнічаюць у гэтых спаборніцтвах нароўні. У Валожынскім раёне летась, як кажа настаўніца Н., мясцовыя ўлады «пашкадавалі» школьнікаў: «Настаўнікі мусілі адпрацаваць «на бульбе» два дні ў тыдзень. А школьнікі тым часам бадзяліся самі па сабе. Нам заявілі, што гэтыя працы — для карысьці самой школы». Яшчэ ўвосень вясковага настаўніка могуць аўральна кінуць рваць буракі, выбіраць з-пад сьнегу моркву, якая пасьля згніе ў буртах. Галоўнае — каб начальства пабачыла прыбраныя палеткі.

Калі настаўнікаў ганяюць на бульбу, навошта тады даваць вясковым абітурыентам дадатковыя балы пры паступленьні ў ВНУ? Анатоль Аўсейчык, настаўнік з Гарадзенскага раёну, упэўнены: «Я з паловы 85-га году займаюся толькі сваёй працай — настаўніцтвам. Не вырошчваю буракоў ці бульбы, не гадую сьвіней. Настаўнік павінен мець час на тое, каб павышаць свой культурны ўзровень, чытаць кнігі. Інакш — што ён прынясе дзецям? Цяпер мне даводзіцца працаваць на трох работах, бо на настаўніцкі заробак не пражывеш. Але адступаць ад сваёй пазыцыі я ня буду».

Праўда, ня ўсе такія прынцыповыя. А то б цяжка было ўладам Баранавіцкага раёну змусіць настаўнікаў летам 2003 г. да выбару — здаць 300 кг сена альбо адпаведную суму грошай. І здавалі. Такую ж практыку, як згадвае былы настаўнік Яўген Пракурат, дэпутат Белаазерскага гарсавету, меліся ўвесьці ў Бярозаўскім раёне, але адумаліся.

Пераплюнуў усіх Мядзельскі раён. Раённаму аддзелу адукацыі давялі заданьне: цягам году настаўнікі раёну мусяць выгадаваць і здаць дзяржаве 60 сьвіней. Эканамічны абсурд! Пэдагогаў вымушаюць працаваць бясплатна, а фэрмэрам немагчыма прадаць сьвінчо. На базары ад гаспадара патрабуюць спраўку пра флюараграфію, у сваё поле на ўласным трактары ня выедзеш без журналу ўліку працоўных гадзінаў, пройдзенага тэхагляду й гары іншых папераў.

У Кітаі падчас «культурнай рэвалюцыі» ставілі доменныя печкі ў кожным двары і ўсенародна лавілі вераб'ёў. Сёньняшнія спробы ўзьняць сельскую гаспадарку рукамі настаўнікаў выглядаюць такімі ж самымі «доменнымі печкамі» на беларускі капыл. А яшчэ ўзьнікаюць асацыяцыі з натуральнай гаспадаркай і паншчынай. У змаганьні за сельгаспаказчыкі «вэртыкаль» запрыгоньвае настаўнікаў. Начальнікі лічаць, што выканаць плян па сельгасработах — важней, чым вучыць дзяцей.

Настаўнікі лічаць, што на такіх «новаўвядзеньнях» улады ня спыняцца. «У нас ходзяць чуткі, што на нейкай нарадзе кіраўнік Менскай вобласьці Дамашкевіч ужо заявіў у адпаведных выразах, што вясковым школьнікам няма чаго сыходзіць на вакацыі. Маўляў, і так цэлы год на сьвежым паветры, аздараўленьня не патрабуюць. Яны павінны гадаваць пры школе трусоў, сьвіней, даглядаць школьны гарод, каб школа сама сябе забясьпечвала», — кажа А. з Крупшчыны.

Міністэрства адукацыі і галіновы прафсаюз адмоўчваюцца. Ніякіх пратэстаў.

Аркадзь Шанскі

Грамадзкая ініцыятыва «За пастаянную працу!»

2004 год распачаўся масавым наступам уладаў на працоўныя правы грамадзянаў — татальным пераводам на кантрактную (часовую) сыстэму працы ўсіх работнікаў дзяржаўных установаў і прадпрыемстваў. Пераход на кантрактную сыстэму азначае часовы характар працы работнікаў ва ўсіх дзяржаўных арганізацыях, бяспраўны стан пры спыненьні кантракту, адсутнасьць кампэнсацыі пры звальненьні, немагчымасьць абскардзіць рашэньне наймальніка ў судзе і атрымаць статус беспрацоўнага. Ні ў воднай краіне сьвету няма такой сыстэмы кантрактаў пры адсутнасьці рэальнай альтэрнатывы дзяржаўнай манаполіі ва ўсіх сфэрах жыцьця.

Падставай для пераводу на кантракт стала даручэньне А.Лукашэнкі Радзе міністраў аб пераводзе на кантракт работнікаў дзяржаўных арганізацый. Гэтае даручэньне можна разглядаць як злоўжываньне сваім службовым становішчам з боку прэзыдэнта.

Існыя ўладныя структуры — Канстытуцыйны суд, Пракуратура, нацыянальны сход, палата прадстаўнікоў, поўнасьцю залежачы ад Адміністрацыі прэзыдэнта, да гэтага часу не прынялі захадаў дзеля абароны правоў працоўных на пастаянную працу. Прадзяржаўныя прафсаюзы самаўхіліліся ад калектыўнай абароны правоў сваіх членаў на пастаянную працу, пераклаўшы цяжар барацьбы на нізавыя прафсаюзныя структуры. Між тым, рэпрэсіўнасьць кантрактнай сыстэмы відавочная на прыкладзе актывістаў Свабоднага прафсаюзу Полацкай ЦЭЦ, якіх выкідаюць з працы на фармальнай падставе за абарону правоў працоўных.

Мы, дэпутаты мясцовых Саветаў, ва ўмовах пераводу краіны ў рэжым часовай працы заклікаем усе дэмакратычныя сілы Беларусі — партыі, дэмакратычныя прафсаюзы, грамадзкія аб'яднаньні, а таксама актыўных грамадзянаў распачаць рух, грамадзкую ініцыятыву «За пастаянную працу!».

Усе дэмакратычныя сілы краіны павінны аб'яднаць намаганьні дзеля адмены кантрактнай сыстэмы працы для працаўнікоў дзяржаўных арганізацый, салідарных дзеяньняў у абарону ўсіх ахвяраў антынародных дзеяньняў наймальнікаў розных узроўняў. Першымі крокамі павінны стаць звароты ў Канстытуцыйны суд, Пракуратуру, нацыянальны сход, палату прадстаўнікоў з патрабаваньнямі адмены масавай кантрактызацыі.

Мы разьлічваем на міжнародную салідарнасьць у абароне права грамадзян Беларусі на пастаянную, годную працу.

М.Афанасьеў, дэпутат Жлобінскага гарсавету;
В.Бычок, дэпутат Маркаўскага с/с;
Л.Гаравы, дэпутат Гарадоцкага райсавету;
А.Міхалевіч, дэпутат Пухавіцкага райсавету

Эстэтычная глухата Міністэрства юстыцыі

Саюз пісьменьнікаў атрымаў папярэджаньне ад Міністэрства юстыцыі. Але шыльду з «Пагоняй» скручваць не зьбіраецца.

Арганізацыі закідаюць «няправільны» выгляд шыльды (гэта першы пункт у папярэджаньні), нясвоечасовую ўплату складак яе сябрамі, адсутнасьць пратаколаў сходаў за другую палову 90-х (пры Зуёнку й Някляеву).

Па-мастацку афармленая шыльда Саюзу пісьменьнікаў, якая выклікала такое абурэньне ў Мінюсту, вісіць на Доме літаратара з пачатку 90-х. На ёй — выява «Пагоні». Шыльда пісьменьнікаў — не кардонная таблічка, а сапраўдны твор мастацтва з тых, якія і праз стагодзьдзе ня страцяць вартасьці. У іншых краінах такія і вісяць сотні гадоў, нягледзячы на зьмены рэжымаў і заканадаўства. Традыцыя! Урэшце, людзі там ня любяць марнаваць ня толькі свае, але й чужыя грошы.

Паводле словаў колішняга кіраўніка СП Васіля Зуёнка, спробы зьнішчыць шыльду ўжо былі: «У сярэдзіне 90-х, пасьля рэфэрэндуму, дырэкцыя Дому літаратара неяк уначы зьняла яе. Але мы тады рашуча выступілі, і яны гэтак жа ціхенька яе вярнулі на месца». Цяперашні намесьнік старшыні СП Міхась Скобла настроены ня менш рашуча: «Мы скручваць яе ня будзем. Рука не падымецца». Зьнішчаць «Пагоню» не падымецца рука ня толькі ў СП. Адзін з кіраўнікоў «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч дэманстраваў пратакол ягонага затрыманьня на беларускай мытні пры канцы сакавіка. Афіцыйныя блянкі Дзяржаўнага мытнага камітэту дагэтуль маюць «Пагоню».

Папярэджаньне Саюзу выглядае палітычна матываваным актам шантажу маладога кіраўніцтва арганізацыі, у чарговы раз выводзячы Саюз пісьменьнікаў у авангард барацьбы за нацыянальныя й палітычныя правы беларусаў.

АШ

Мая жонка — рэвалюцыя!

А ў вольны час я пішу прозу

«Калі ты любіш нашага героя так, як мы, перапішы гэты ліст дзевяць разоў, дашлі сябрам і знаёмым. Адзін хлопчык парваў гэты ліст, запісаўся ў апазыцыю, дык цяпер вучыцца ў Праскім ўнівэрсытэце й слухае беларускі рок. А адна дзяўчынка перапісала гэты ліст 999 разоў, і, калі яе адкачалі, паехала ў вёску Задуп'е Чарнобыльскага раёну. Цяпер яна — паважаны чалавек, выкладчыца «беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі».
Такі ліст атрымалі 1 красавіка менчукі ад людзей у жоўтых майках, якія называлі сябе «лімонамі». 1 красавіка адзначыў у Менску Алесь Карніенка, якому забаранілі правесьці ў гэты дзень у Гомелі акцыі «ў падтрымку Лукашэнкі з мэтай выказаць бязьмежнае захапленьне асобай і справамі прэзыдэнта РБ».

Алесь Карніенка нарадзіўся ў 1972, сябар палітрады АГП. Скончыў Гомельскі дзяржаўны ўнівэрсытэт, інжынэр-фізык. У 1993—95 сябар БНФ, з 1996 сябар АГП, заснавальнік і кіраўнік гомельскай грамадзкай арганізацыі «Гарт» (ліквідаваная Мінюстам у 2003), пазьней — моладзевага крыла АГП. У 2003 абараніў працу па тэме «Моладзевыя арганізацыі пры палітычных партыях у Польшчы» ў Варшаўскім унівэрсытэце. Апазыцыйная дзейнасьць Алеся пачалася яшчэ ў 1988, калі ён раскрытыкаваў школьную камсамольскую арганізацыю. Уратавала тое, што ён быў найлепшым вучнем.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН»: Алесь, хто такія «лімоны» і чаму ўзьнікла такая імпрэза?

Алесь Карніенка: 1 красавіка — гэта адзіны дзень у годзе, калі можна шчыра папрыдурвацца. А нашай апазыцыйнай палітыцы так не хапае гумару і нестандартнасьці. Нас загналі ў рамкі, калі нічога не дазваляецца... Зь іншага боку, і людзі стомленыя ад цяжкой прапаганды. Нашы бедныя грамадзяне і не за Лукашэнку, але й ня могуць атаясаміць сябе з апазыцыяй. Таму трэба паказаць ім сьвятло ў канцы тунэлю. Гэта добра, калі людзі пачынаюць сьмяяцца. Каб змагацца з драконам, можна альбо самому стаць драконам, альбо паказаць, што той дракон — усяго толькі маленькі гумовы яшчар. А лімоны — гэта папросту людзі, апранутыя ў жоўтае.

«НН»: Алесю, куды зьнікла палітычна актыўная беларуская моладзь?

А.К.: Моладзевы рух сканаў. Здох пасьля прэзыдэнцкіх выбараў і дайшоў год таму падчас мясцовых. Скончылася пакаленьне 96-га году — як маса, а не як лідэры. Сёньняшнія 17—18-гадовыя дзеткі — ня тыя, хто дыхнуў беларускасьці, адраджэньня й дэмакратыі, хто спадзяваўся, што з дапамогай некалькіх дэманстрацый можна дасягнуць свабоды. Як я некалі спадзяваўся. Цяпер людзі зусім іншыя, дыктатура шмат гадоў трывае, ідэалягічная апрацоўка працягваецца… Дзеці 96-га вырасьлі. Нехта стаў лідэрам «дарослай» арганізацыі, нехта стварае свой блёк, пара лідэраў «Зубра» і МФ у Горадні займаюць высокія пасады ў БРСМ. Знайшлі сябе ў сыстэме. Але пераход 100 чалавек з баранавіцкага БРСМ у «Зубр» натхняе. Хутка мы пабачым рэнэсанс руху моладзі.

«НН»: Кажаш, «здох»? А як жа «Маладая Беларусь»?

А.К.: Скарасьпелая ініцыятыва. Моладзь — вялікі рэсурс дэмруху. Але ніхто ня будзе галасаваць за моладзевыя партыі. Роля моладзі трошкі іншая. Маладыя радыкальна настроеныя змагацца за перамогу — ці ў сваёй акрузе, ці ўвогуле ў краіне. Мы ў свой час «узялі» Палац прафсаюзаў. На жаль, не было кандыдата, за якога варта было б і хацелася б змагацца. Але сярод тых 220 удзельнікаў «Пяцёркі» і яшчэ некалькіх людзей, якія ў «Пяцёрку» не ўвайшлі, будзе за каго змагацца. Большасьць нашых лідэраў — і старых, і маладых — можа прэтэндаваць на перамогу ў сваіх акругах. Галоўнае — ці здолеем мы гэты выбар абараніць.

«НН»: А сёньняшнія лідэры — хто?

А.К.: «Хто замест яго?» — гэтае пытаньне нам увесь час задавалі людзі ў Гомелі падчас кампаніі супраць трэцяга тэрміну. На мой погляд, альтэрнатыва — гэта мы ўсе разам, усе гэтыя 110+110.

«НН»: Каго б ты хацеў бачыць кіраўніком дзяржавы?

А.К.: Сумленнага, маладога і праўдзівага чалавека, здольнага да нестандартных крокаў у палітыцы. І каб чалавек адкрыта сказаў яшчэ перад выбарамі, што ён за дэмакратыю і незалежнасьць.

«НН»: Якія шанцы, на твой погляд, маюць дэмакратычныя кандыдаты на выбарах у палату прадстаўнікоў?

А.К.: Ва ўмовах больш-менш дэмакратычных я мог бы прамовіць грузінскі тост «За грузінскі варыянт!», вось тут пабажыцца, што мы возьмем ня тое што 50%, але 70% мандатаў. Але: фальсыфікацыі будуць, доступу да СМІ ня будзе. Сьцьвярджаць, што мы выйграем, немагчыма. Тым больш што заваёва 50% месцаў у палаце нічога не вырашае. Паводле заканадаўства, калі ПП два разы адхіляе закон, унесены прэзыдэнтам, ён мае права распусьціць палату. У нас амаль не засталося СМІ. Людзі перасталі цікавіцца палітыкай. Яны баяцца, што любая актыўнасьць можа прывесьці да рэпрэсій, да праблем на працы, на вучобе. Таму кампанію трэба выкарыстаць, каб данесьці да людзей альтэрнатыву. Што ёсьць ідэі, уяўленьне, куды павінна рухацца краіна.

Пры гэтым я не кажу, што мы ня можам раптам атрымаць вынікі большыя, чым мы ставім. Цалкам магчыма, што нехта верыць у сваю перамогу, верыць у свой мандат.

«НН»: А ты?

А.К.: Я веру ў тое, што раблю вельмі важную справу. Я сябе разглядаю не як палітыка, а як грамадзкага дзеяча і таму раблю гэта, каб усё ж такі пабачыць сваю краіну вольнай, дэмакратычнай, заможнай і эўрапейскай.

> Дзеці 96-га вырасьлі і гатовыя ўзяць на сябе адказнасьць за краіну.

«НН»: Перад мясцовымі выбарамі 2003 г. была тэорыя, што трэба ўдзельнічаць, каб навучыцца і перамагчы ў 2004-м. Цяпер ізноў...

А.К.: Улада сканцэнтраваная ў руках Лукашэнкі. Толькі зьмяніўшы пэрсаналію і сыстэму, можна зьмяніць нешта ў нашым жыцьці. Мы ў Гомелі ходзім па кватэрах, зьбіраем подпісы за зьмяншэньне камунальных плацяжоў. Дык працэнтаў трыццаць яшчэ гатовыя падтрымліваць уладу. Яны не падпісваюцца, бо мы супраць Лукашэнкі. Яшчэ працэнтаў трыццаць выступаюць вельмі актыўна супраць улады, гатовыя падпісацца, не баючыся словаў «Аб'яднаная грамадзянская партыя». І 40% баяцца ці запалі ў глыбокую апатыю.

«НН»: Якіх пераменаў ты жадаеш для свайго гораду?

А.К.: Самае важнае — гэта мясцовае самакіраваньне. Мясцовыя кіраўнікі павінны абірацца, а не прызначацца зьверху. Патрэбныя асобныя мясцовыя бюджэты. Тады палітыкі і мясцовая ўлада наблізяцца да людзей і праблемы пачнуць вырашацца. Мясцовыя кіраўнікі будуць залежаць ад людзей і дбаць, каб іх перабралі.

«НН»: Дзе гарантыя, што дэмакраты будуць лепшымі кіраўнікамі за сёньняшнюю ўладу?

А.К.: Гарантыя ў тым, што гэта ня будзе кіраваньне адной асобы. Іншая гарантыя — у чалавечых якасьцях апазыцыйных лідэраў. Ніхто зь іх не дазволіць сабе разганяць мірныя дэманстрацыі ці абражаць міністраў перад камэрамі. Гэта проста іншы стыль кіраваньня. Дэмакратыя — гэта ня столькі падзел улады, колькі культура і традыцыя. І да яе нам яшчэ далёка ісьці. Мы ўсе родам з Савецкага Саюзу, і нездарма ж Майсей вадзіў свой народ 40 гадоў, пакуль не памёр апошні, хто ведаў рабства.

«НН»: Часта апазыцыю вінавацяць у бязьдзеяньні, у тым, што ёй ня хочацца сур'ёзна нешта мяняць, бо захаваньне дыктатуры — гарантыя грашовых паступленьняў з-за мяжы.

А.К.: Гэта чыстая прапаганда. Фонды, якімі пужаюць нашых грамадзян, абсалютна легальныя ў іншых краінах. Толькі па віне Лукашэнкі ўсе фонды выгналі зь Беларусі, а гэта ж таксама інвэстыцыі. Інвэстыцыі, якія не працуюць па віне Лукашэнкі. Тыя лічбы, якія называе прапаганда, — хацеў бы я пабачыць такія грошы. А вось лічба з бюджэту РБ за 2003 г. у 213 млрд руб. на Рэзэрвовы фонд прэзыдэнта — гэта рэальнасьць! Пры выдатках на ЖКГ толькі ў 1,9 млрд. Вось і параўнайце. Мяне ўвосень аштрафавалі за правядзеньне грамадзкага галасаваньня на 100 базавых велічыняў (каля 700 даляраў), а нядаўна майго найбліжэйшага памочніка Арцёма Бурылу асудзілі за «кантрабанду» ўлётак. У пастанове суду напісана, што ўлёткі мелі «значную матэрыяльную каштоўнасьць». Так што я заклікаю ўсіх уступаць у шэрагі апазыцыі: мы тут дзіка навараваемся на кантрабандзе ўлётак. А каму не дасталася ўлётак, можаце купіць іх у крамах, якія гандлююць канфіскатам.

> Апазыцыйныя гранты? Гэта чыстая прапаганда. А вось лічба 213 мільярдаў рублёў у Рэзэрвовым фондзе прэзыдэнта — гэта рэальнасьць.

«НН»: Вылучаешся ў палату — а рэпрэсій не баішся?

А.К.: Не баюся. Можа быць, узьнікне страх, калі я буду стаяць недзе ў яме каля Паўночных могілак. Не раней. Усе мае продкі былі змагарамі. Мой прадзед пры саветах 10 гадоў правёў за кратамі. Яго спачатку раскулачылі, пасьля абвінавацілі ў шпіянажы — ён паходзіў са старажытнага шляхетнага роду Раткевічаў, за гэта яго і пакаралі. А род прасочваецца з XII ст. Іншы мой прадзед быў напалову казак, ён паходзіў з казачага стану ў Чачэніі. Гэта, напэўна, гены не даюць мне спакою.

Дый прозьвішча маё ў Гомелі адназначна асацыюецца з дэмакратыяй — дзякуючы Віктару Карняенку, якога ў 1989 г. паўгораду выбрала ў Вярхоўны Савет Савецкага Саюзу. Мы зь ім не сваякі, і прозьвішчы нават пішуцца па-рознаму на адну літару, але ідэйная роднаснасьць ёсьць: Віктар Карняенка быў адным з тых, хто паўплываў на маё далучэньне да дэмакратычнага руху. У Гомелі гэта тое ж самае, як калі б маё прозьвішча было Бушмалодшы.

«НН»: Хто для цябе прыклад у палітыцы?

А.К.: Аўраам Лінкальн, а з нашых гістарычных дзеячоў — Тадэвуш Касьцюшка і асабліва Кастусь Астроскі, які мог чаго заўгодна дасягнуць у іншай краіне, але вярнуўся на радзіму, зьбег з маскоўскага палону. За апошнія гады я некалькі разоў стаяў перад выбарам: зьехаць, застацца за мяжой ці нават папросту пайсьці з палітыкі, зарабляць грошы. Я б, напэўна, так і зрабіў, калі б не баяўся, што тое, што адбываецца, — ня проста пытаньне часу, а пытаньне гістарычнае — ці будзе Беларусь існаваць на мапе Эўропы.

«НН»: Ці ёсьць у Алеся Карніенкі прыватнае жыцьцё?

А.К.: Як казаў раней Ясір Арафат: мая жонка — рэвалюцыя!

«НН»: Можа быць, наадварот — рэвалюцыя не пакідае часу на прыватнае жыцьцё?

А.К.: Не, мяне няшчаснае каханьне стымулюе. А калі сур'ёзна, то каханьне — важная рэч для мяне, але пакуль «не супала».

«НН»: Чым ты займаешся ў вольны час?

А.К.: Спортам. Цяпер мы з усёй маёй перадвыбарчай камандай вучымся катацца на кані. Яшчэ пішу для сябе сьмешныя кароткія празаічныя рэчы. Раней пісаў вершы пра герояў трэцяга сэктару.

«НН»: Колькі часу ты праводзіш у Гомелі?

А.К.: Па 40% у Менску і Гомелі, астатнія 20% — у цягніках. Насамрэч я кланаваўся, адзін клон жыве ў Гомелі, а другі ў Менску.

Гутарыла Вераніка Дзядок

Ці трэба Беларусі ўступаць у Эўразьвяз

У траўні гэтага году нашы суседзі зробяцца паўнапраўнымі сябрамі Эўразьвязу. З нагоды гэтае гістарычнае падзеі шмат хто з палітыкаў ды журналістаў зьвяртае ўвагу на станоўчыя бакі «пашырэньня Эўропы» як для самога Зьвязу, так і для кандыдатаў. Аднак жа ў кожнага мэдаля ёсьць два бакі. Несумненна, уступленьне ў Зьвяз нясе з сабой і рызыкі, якія асабліва важна ўлічваць, распрацоўваючы замежнапалітычную канцэпцыю будучае вольнае Беларусі.



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

ЭЗ на сёньняшні дзень складаюць Нямеччына, Францыя, Італія, Бэльгія, Грэцыя, Гішпанія, Ірляндыя, Данія, Люксэмбург, Аўстрыя, Партугалія, Фінляндыя, Швэцыя, Вялікая Брытанія, Нідэрлянды (на мапе — чорным). 1 траўня далучацца Эстонія, Латвія, Літва, Польшча, Славенія, Славакія, Чэхія, Мальта, Кіпр, Вугоршчына. Беларусь пакуль ня вызначылася.

Дзеля нагляднасьці падзелім гэтыя рызыкі на эканамічныя, замежнапалітычныя і этнічныя.

Адным з самых важкіх аргумэнтаў на карысьць далучэньня да Зьвязу заўсёды было жаданьне новых усходнеэўрапейскіх дэмакратый дасягнуць заходняга ўзроўню жыцьця і эканамічнай разьвітасьці ў разьліку на заходнюю дапамогу. На жаль, сёньняшняя эканамічная сытуацыя ў Заходняй Эўропе не абяцае цяперашнім і тым болей будучым кандыдатам у Зьвяз «манны нябеснай». Стрыжнёвыя краіны Зьвязу — Нямеччына, Францыя і Італія — перажываюць сур'ёзны эканамічны крызыс. Усім вядома няздольнасьць гэтых краін да рэфармаваньня сацыяльных сыстэм дзеля вырашэньня праблем беспрацоўя ды старэньня насельніцтва. Часам здаецца, што заходнеэўрапейскія грамадзтвы заснулі недзе ў 60-х гадах падчас эканамічнага буму і клясавых бітваў ды прачнуліся ў пачатку XXI ст. са старым наборам лявацкіх ідэалістычных догмаў, непрыдатных для сёньняшняга глябалізаванага сьвету. Пра пляны Зьвязу стаць самай дынамічнай эканамічнай супольнасьцю да 2010 г. (так званы «Лісабонскі пратакол») ніхто ўжо сур'ёзна ня згадвае. Ідэалягічная зашоранасьць ды недааацэнка важнасьці эканамічных праблем будуць рабіць Эўропу ўсё болей адсталым рэгіёнам у канкурэнтнай барацьбе са Злучанымі Штатамі ды Азіяй. Адставаньне Эўропы ў тэмпах росту эканомікі ў хуткім часе адаб'ецца і на сацыяльным становішчы ды бюджэце Зьвязу. У гэтых умовах новым сябрам наўрад ці варта будзе разьлічваць на грунтоўную фінансавую дапамогу з Брусэлю, якая ў мінулым паставіла на ногі гішпанцаў ды ірляндцаў.

Акрамя таго, сацыялістычная арыентаванасьць заходнеэўрапейцаў (слова «лібэрал» у сэнсе эканамічных поглядаў успрымаецца шмат дзе ў Заходняй Эўропе як лаянка) можа прывесьці да непасрэднага сутыкненьня інтарэсаў Захаду і Ўсходу. Так, незадаволенасьць заходнікаў выклікае лібэральная падатковая палітыка краін-кандыдатак. Значна ніжэйшыя падаткі на ўсходзе Эўропы робяць гэты рэгіён больш прывабным для заходнеэўрапейскіх прадпрыемстваў, што выліваецца ў экспарт працоўных месцаў і зьмяншэньне паступленьняў у заходнеэўрапейскія бюджэты. Але замест таго каб самім зьніжаць падаткі, немцы і французы патрабуюць ад усходнеэўрапейцаў (зрэшты, як і ў Ірляндыі) спыненьня «падатковага дэмпінгу», а ў адваротным выпадку пагражаюць перагледзець пляны дапамогі Ўсходу. Вядома таксама, што грамадзяне краін-кандыдатак не адразу атрымаюць доступ да працоўных рынкаў Заходняе Эўропы. І гэта толькі пачатак. Барацьба супраць пераразьмеркаваньня працоўных месцаў яшчэ толькі набірае абароты і можа прывесьці да ўсё новых абмежаваньняў для руху капіталу і працы ў межах Зьвязу.

Другі варты згадкі аспэкт — замежная палітыка. Не зьяўляецца таямніцай, што замежнапалітычная арыентацыя нашых суседзяў трохі адрозьніваецца ад францускай і нямецкай. Усходнеэўрапейцы застаюцца вернымі стратэгічнаму партнэрству са Злучанымі Штатамі, у той час як французы і немцы распрацоўваюць пляны стрымліваньня амэрыканскага дамінаваньня. Каб пакінуць за Францыяй, Нямеччынай ды іх аднадумцамі вырашальны ўплыў на замежныя прыярытэты Зьвязу, праект новае эўрапейскае Канстытуцыі прадугледжвае «супольную замежную палітыку» і адмену прынцыпу «адна краіна — адзін голас» на карысьць прапарцыйнага прадстаўніцтва ў замежнапалітычных органах. Залішне і казаць, што такі расклад не пакідае ўсходнеэўрапейскім краінам ніякіх шанцаў на незалежную замежную пазыцыю (першай гэта зразумела Польшча, якая пакуль не прыняла праекту). Усе памятаюць камэнтар францускага прэзыдэнта Жака Шырака на падтрымку ўсходнеэўрапейцамі амэрыканскае ваеннае апэрацыі ў Іраку: маўляў, «усходнеэўрапейскія краіны страцілі добрую нагоду прамаўчаць». Колькі такіх «нагод прамаўчаць» зьявіцца ў будучыні, можна толькі здагадвацца.

> Шлях Швайцарыі, Нарвэгіі і Ісьляндыі для Беларусі выгаднейшы за ўступленьне ў Эўразьвяз. Што да стратэгічных інтарэсаў Беларусі ў галіне бясьпекі, то яны могуць быць забясьпечаны толькі сяброўствам у NATO.

Нарэшце, этнічны чыньнік. Адной з самых балючых праблем Зьвязу застаецца павольная інтэграцыя мусульманскай меншасьці. На сёньняшні момант у Зьвязе жыве каля пятнаццаці мільёнаў мусульман. Іх колькасьць будзе ўвесь час расьці дзякуючы вялікім тэмпам нараджальнасьці. Само па сабе гэта не было б бядой, калі б толькі альжырцы ў Парыжы ці туркі ў Бэрліне адчувалі сябе грамадзянамі Эўропы. Аднак мусульманскія меншасьці ня толькі не прымаюць эўрапейскіх каштоўнасьцяў, але і нараджаюць у сваім асяродзьдзі радыкальныя ісламскія групоўкі зь іх нянавісьцю да Захаду і гатоўнасьцю да гвалту. Вядома, што тэракты 11 верасьня ў Амэрыцы рыхтаваліся жыхарамі Эўропы арабскага паходжаньня. Эўропа доўгі час прытрымлівалася думкі, што ісламскі тэрарызм яе не датычыць. На жаль, тэракты ў Гішпаніі прадэманстравалі адваротнае. З праблемамі інтэграцыі мусульманскіх меншасьцяў давядзецца сутыкнуцца і ўсходнеэўрапейцам. Турэцкія альбо мараканскія кварталы ў Вільні могуць стаць рэальнасьцю. І самае галоўнае, што ўсходнеэўрапейцы ня змогуць эфэктыўна процідзейнічаць ісламісцкай пагрозе, ня маючы рычагоў самастойнага вызначэньня эміграцыйнай палітыкі.

Праўда, сцэнар далейшага паглыбленьня інтэграцыі ў межах Эўразьвязу не зьяўляецца адзіна магчымым. Пляны далучэньня да Эўрасупольнасьці Турцыі як паўнапраўнага сябра нясуць рызыку ператварэньня Зьвязу ў «не зусім эўрапейскі» і «не зусім Зьвяз». Можна прадбачыць, што памкненьні Турцыі будуць пасьпяховымі, улічваючы стратэгічную важнасьць гэтае краіны для Захаду як прыкладу для астатняга мусульманскага сьвету. У гэтым выпадку можна прагназаваць дэградацыю Зьвязу да ўсяго толькі супольнасьці з супольнай эканамічнай прасторай ды парай–тройкай наддзяржаўных бюракратычных надбудоў накшталт «камітэту аховы помнікаў эўрапейскае ды азіяцкае даўніны».

Але ж і ў такім «друзлым» Зьвязе, і ў магчымай «Фэдэрацыі антыамэрыканскіх народаў Эўропы» Беларусі рабіць няма чаго. Для нас найважнейшым зьяўляецца эканамічнае супрацоўніцтва з Эўропай, а дзеля гэтага, як паказвае прыклад Швайцарыі, Нарвэгіі і Ісьляндыі, уступаць у Зьвяз неабавязкова. Самай зручнай формай супрацоўніцтва са Зьвязам будзе асацыяванае членства ў супольнай эканамічнай прасторы. Дасягнуць такога статусу Беларусі будзе значна прасьцей і, больш за тое, выгадней, бо Заходняя Эўропа будзе заахвочваць сваіх усходніх суседзяў рабіць выбар на карысьць менавіта «мяккага сяброўства». Прыйшоў час зразумець, што «вяртаньне Беларусі ў Эўропу» і «ўступленьне Беларусі ў Эўразьвяз як паўнапраўнага члена» — ня тоесныя паняцьці.

Што ж да стратэгічных інтарэсаў Беларусі ў галіне бясьпекі, то яны могуць быць забясьпечаны толькі сяброўствам у NATO. NATO на сёньняшні момант — адзіная вайскова-палітычная структура ў Паўночным паўшар'і, здольная даць адэкватныя адказы на выклікі міжнароднага тэрарызму і пры неабходнасьці абараніць беларускую незалежнасьць. Нездарма самыя «прасунутыя» ўсходнеэўрапейскія краіны Вышаградзкае групы (Польшча, Чэхія і Вугоршчына) найперш уступілі ў NATO, а потым ужо і ў Зьвяз. Беларускі шлях у NATO да стратэгічнага партнэрства са Злучанымі Штатамі будзе доўгім і цярністым, улічваючы цяперашні рэжым ды савецкае паходжаньне беларускае намэнклятурнае эліты. Але ж мы гэты шлях пройдзем. А пра мэты, як і куды ісьці, варта размаўляць ужо сёньня, тым больш што чакаць зьмен у Беларусі засталося ўжо нядоўга.

Сяржук Вінаградаў

Бунт супраць Шэймана

Лепш ужо карупцыя!

Супраць галасавалі гаспадарнікі і чыноўнікі. Усе яны ў вачах Пракуратуры патэнцыйныя карупцыянэры. А Шэйман у іхных вачах — патэнцыйны Вышынскі. Дэпутаты палаты прадстаўнікоў адхілілі прапанаваны прэзыдэнтам законапраект «Аб барацьбе з карупцыяй».

33 прагаласавалі за прыняцьце закону, 30 — супраць, а 20 дэпутатаў палічылі за лепшае ня ўдзельнічаць у небясьпечным галасаваньні. У выніку 9 красавіка палата прадстаўнікоў «завярнула» законапраект, накіраваўшы яго на дапрацоўку ў камісію па нацыянальнай бясьпецы. Праект меўся заканадаўча замацаваць істотнае пашырэньне паўнамоцтваў пракуратуры, якое на практыцы ўжо існуе.

Гайкі таксама не жалезныя

11 сакавіка выйшла «дысцыплінарная» дырэктыва №1. 30—31 сакавіка Аляксандар Лукашэнка зьлятаў у Берасьце, дзе заявіў, што берасьцейскую вэртыкаль «наскрозь пранізала карупцыя». Генэральны пракурор Віктар Шэйман, які двойчы на месяц кансультуе прэзыдэнта аб сытуацыі ў краіне, 6 красавіка чарговы раз даклаў: супраць вэртыкальшчыкаў зь Берасьцейшчыны ўзбуджана 11 крымінальных справаў, сьледзтва па яшчэ чатырох, раней прыпыненых, адноўлена, адменены 11 пастаноў пра адмову ва ўзбуджэньні крымінальных спраў. Пад антыкарупцыйную касілку патрапілі службовыя асобы аблвыканкаму, Бярозаўскага райвыканкаму, Берасьцейскага ды Кобрынскага гарвыканкамаў.

Намесьнік Генпракурора Віктар Прус, які прадстаўляў дэпутатам законапраект аб барацьбе з карупцыяй, тлумачыць неабходнасьць узмацненьня барацьбы тым, што «карупцыя зьяўляецца прыдатнай глебай для разьвіцьця арганізаванае злачыннасьці й непасрэдна пагражае нацыянальнай бясьпецы любой дзяржавы».

Ценявая эканоміка Беларусі складае, паводле неафіцыйных ацэнак В.Пруса, 17—18% ад ВУП, ці 3 мільярды даляраў.

За 2003 г. у Беларусі зьдзейсьнена 4815 злачынстваў, якія падпадаюць пад азначэньне карупцыйных. Завершаны разбор 946 справаў, зь якіх 580 справаў па абвінавачаньні ў хабарніцтве перададзеныя ў Вярхоўны суд. Сур'ёзную праблему для Беларусі ўяўляе «адмываньне даходаў, атрыманых незаконным шляхам». Банкі не вярнулі 50 млн даляраў крэдытаў; схаваліся ад сьледзтва звыш як 70 чалавек. 8 зь іх абвінавачваюцца ў хабарніцтве, 65 — у невяртаньні банкаўскіх крэдытаў. Беларусь у антыкарупцыйным рэйтынгу займае 52-е месца сярод 133 краінаў сьвету.

Галоўная патрэба закручваньня гаек, паводле Віктара Пруса, — эканамічная.

Ня вытрымаў уладальнік «Дарыды»

Законапраект вызначае меры папярэджаньня карупцыі і праяў карумпаванасьці, аднак закон законам, а на практыцы ўлада сама штурхае чынавенства на карупцыйныя дзеяньні. Пра тое В.Прусу заявіў у Авальнай залі дэпутат Уладзімер Дзялендзік. Ён прывёў прыклад канкрэтнае сытуацыі з досьведу свайго прадпрыемства.

У.Дзялендзік зьяўляецца заснавальнікам УПП «Дарыда» — лідэра вытворчасьці мінэральнай і пітной вады на беларускім рынку. Менская і лідзкая вэртыкалі ў адзін дзень — 15 сакавіка — выдалі загад і распараджэньне для прадпрыемстваў гандлю забясьпечыць пастаянную прысутнасьць у продажы прадукцыі шэрагу вытворцаў.

Начальнік упраўленьня спажывецкага рынку Менгарвыканкаму Міхаіл Еўтухоўскі «ў мэтах забесьпячэньня належнага гандлёвага абслугоўваньня насельніцтва праз дробнааптовую гандлёвую сетку, своечасовай падрыхтоўкі прадпрыемстваў гандлю і грамадзкага харчаваньня да сэзоннага гандлю ў 2004 г.» загадаў «забясьпечыць пастаянны продаж поўнага асартымэнту марожанага Менскага холадакамбінату №2, прадукцыі ААТ «Крыніца», ААТ «Аліварыя», ЗАТ «Менскі завод безалькагольных напояў», СП «Аква-Трайпл». Вэртыкаль Ліды і раёну загадала гандлю давесьці асартымэнт ААТ «Лідзкае піва» да 90%, а на долю ўсіх астатніх засталося ня больш за 10%.

Між тым, на айчынным рынку мінэральнай і пітной вады УПП «Дарыда» ўпэўнена трымае першае месца сярод больш чым 45 вытворцаў, пастаўляючы траціну ўсяе прадукцыі. «Дарыда» ўваходзіць і ў «тройку» лідэраў сярод звыш 60 вытворцаў безалькагольных газаваных напояў, саступаючы першынство толькі кампаніі «Coca-cola» і «Вяйнянскай крыніцы». З пускам на пачатку красавіка новае італьянскае лініі па вытворчасьці негазаванай мінэральнай вады і негазаванай пітной вады «Дарыда» разьлічвае павялічыць выпуск мінэралкі на 30%, а экспарт за 2004 г. мяркуе павялічыць да 20%. Чаму тады адзін зь лідэраў рынку мінэральнай вады павінен даваць хабар, каб мець магчымасьць прадаваць уласны тавар, абураўся дэпутат.

«Мы самі ствараем умовы для карупцыі. Возьмем загад упраўленьня гандлю Менгарвыканкаму. Дырэктар «Дарыды», кіраўнікі іншых прадпрыемстваў, якія не атрымалі гэткіх ільгот, пастаўлены ва ўмовы, калі трэба даваць хабар чыноўнікам. Таму генэральная пракуратура мусіць праверыць усе інструкцыі, палажэньні, загады і рашэньні на прадмет антыкарупцыйнасьці; Міністэрства юстыцыі мусіць рэгістраваць падобныя дакумэнты і правяраць на адпаведнасьць заканадаўству, бо менавіта такія нарматыўныя акты ствараюць умовы для таго, каб кіраўнікі прадпрыемстваў давалі хабар. А то мы самі ствараем глебу для карупцыі, а пасьля прымаем закон «Аб барацьбе з карупцыяй», — абураецца У.Дзялендзік.

Факт — прыватны, але паказальны: надаючы асобным прадпрыемствам перавагі, вэртыкаль сама рыхтуе глебу для росквіту хабарніцтва. І прымай хоць сто законаў аб барацьбе з карупцыяй, пры такім стаўленьні ўлады да законаў нічога ня зьменіцца. Таму 7 красавіка дэпутат накіраваў скаргу на імя пракурора Менску Мікалая Куліка з просьбай «зрабіць захады да недапушчэньня надалей праяў нядобрасумленнай канкурэнцыі, дыскрымінацыйных умоў дзейнасьці для асобных суб'ектаў гаспадараньня».

Лечаць не праявы, а прычыны хваробы

Лідэр дэпутацкай групы «Рэспубліка» Сяргей Скрабец мяркуе, што пракуратура Беларусі і сёньня мае досыць паўнамоцтваў для барацьбы з карупцыяй, чым, зрэшты, і займаецца.

«Калі чалавеку баліць галава, ён прымае таблетку. Але таблеткай ён здымае боль, а ня лечыць карані хваробы. Так і тут: калі ёсьць карупцыя, трэба прымаць закон аб барацьбе з карупцыяй. Але ж карані хваробы пад назвай «карупцыя» абсалютна ў іншым — у сыстэме самой улады. Таму нельга расцэньваць закон інакш як чыста палітычны, скіраваны на ўмацаваньне самое ўлады», — гаворыць С.Скрабец.

На думку дэпутата, і кампанія па ўстанаўленьні дысцыпліны, і сам «законапраект зьвязаны з выбарамі ў парлямэнт: кожнага дэпутата можна пасадзіць за работу з выбаршчыкамі на той падставе, что ён мае немаёмасныя інтарэсы», — рэзюмаваў С.Скрабец.

Уладзімер Дзялендзік, заснавальнік «Дарыды»: «Мы пастаўлены ва ўмовы, калі трэба даваць хабар чыноўнікам».

Сакавіцкае апытаньне НІСЭПД (апытана 1480 чалавек 18 гадоў і старэйшых мэтадам face-to-face interview, памылка рэпрэзэнтатыўнасьці не перавышае 0,03) паказала: толькі палова беларусаў (47%) ніколі не сутыкалася зь неабходнасьцю «даваць на лапу» чынавенству. Астатнія спазналі эфэктыўнасьць хабару пры вырашэньні набалелых праблем на практыцы. 30,5% апытаных давалі хабар работнікам аховы здароўя, 17,7% — дзяржаўным чыноўнікам, 15,3% — работнікам праваахоўных органаў, 13,3% — работнікам адукацыі, 5,3% — работнікам недзяржаўнай сфэры, 3,7% — работнікам сфэры гандлю.

Як тут быць? На адкрытае пытаньне «Што, на Ваш погляд, трэба зрабіць, каб паменшыць карупцыю ў нашым грамадзтве?», на якое можна было даваць больш за адзін адказ, большасьць — 42,7% рэспандэнтаў — адказалі: узмацніць кантроль і павысіць адказнасьць чыноўнікаў. Яшчэ 18,5% лічаць, што трэба «рэфармаваць дзяржаўны апарат», і амаль столькі ж — 17,2% — выступаюць за павелічэньне чыноўнікам заробкаў.

Асноўная маса апытаных, па сутнасьці, перакананая: бязь зьменаў у сыстэме ўлады змагацца з карупцыяй бессэнсоўна. Закон жа «Аб барацьбе з карупцыяй» найперш скіраваны на пашырэньне правоў пракуратуры Беларусі. З трох найпапулярнейшых адказаў наконт шляхоў змаганьня з карупцыяй толькі першы часткова асьвятляецца ў законапраекце, які выклікаў пратэсты ня толькі групы «Рэспубліка», але і недалучаных да фракцый дэпутатаў.

«Лепш ужо карупцыя, чым беззаконныя паўнамоцтвы тых, хто мусіць сачыць за выкананьнем законаў», — так палічылі дэпутаты. Рэдкі выпадак волевыяўленьня дэпутатаў не павінен застацца без рэакцыі. Няшмат шанцаў на тое, што ўплыў Шэймана аслабне. Хутчэй завадатарам дэпутацкага бунту дадуць у карак і выкрасьляць з «прэзыдэнцкага сьпісу» на парлямэнцкіх выбарах.

Глеб Хмяльніцкі

ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

Міністэрства інфармацыі 5 красавіка вынесла папярэджаньне **«Местной газете»**: што не паведаміла чыноўнікам пра зьмену ў пэрыядычнасьці выхаду, пашырыла тэрыторыю распаўсюду й недакладна афармляе выходныя зьвесткі. Падчас «Ланцугу неабыякавых людзей» у Менску 6 красавіка за раздачу ўлётак затрымалі актывістаў АГП **Марыну Багдановіч** і **Андрэя Козела**. **Уладзімера Леванеўскага** затрымалі на рынку ў Горадні падчас распаўсюду ўлётак і бюлетэню «Предприниматель». 7 красавіка суд Цэнтральнага раёну Менску адмовіў у пазове Беларускаму кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў аб аднаўленьні на працы былога старшыні Менскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюзу работнікаў культуры **Ўладзімера Мамонькі**. Мамонька лічыць, што яго звольнілі за зварот у Міжнародную арганізацыю працы наконт парушэньня правоў прафсаюзаў у Беларусі. Кіраўніку ПБНФ **Вінцуку Вячорку** 7 красавіка не далі сустрэцца з студэнтамі гісторыка-філялягічнага факультэту Полацкага ўнівэрсытэту: лекцыю «Праблемы рэфармаваньня беларускага правапісу і пашырэньня сфэры ўжытку беларускай мовы ў сучасных умовах» адмянілі за некалькі гадзінаў да пачатку. Наклад недзяржаўнай газэты **«День»** сканфіскавалі пры дастаўцы ў Горадню 7 красавіка работнікі АБЭЗ. Журналісты перакананыя, што газэту затрымалі на загад спэцслужбаў. Міліцыянты Горадні затрымалі 7 красавіка аўтамабіль кіраўніка абласной арганізацыі АГП **Уладзімера Чырвоненкі** з улёткамі «Пяцёркі плюс». Разам з Чырвоненкам затрымалі старшыню мясцовага аддзяленьня ПБНФ **Сяргея Мальчыка**. Актывістаў Свабоднага прафсаюзу беларускага **Ўладзімера Антановіча** і **Віктара Стукава** ў Полацку затрымалі міліцыянты «за ўдзел у несанкцыяваным пікетаваньні», на наступны дзень ім вынесьлі судовыя папярэджаньні. 9 красавіка суд Першамайскага раёну Менску адхіліў скаргу **Беларускага Хельсінскага камітэту** і ягонай старшынькі **Тацяны Процькі** да БТ аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі. Канстытуцыйны суд 9 красавіка адмовіўся разглядаць заяву старшыні незалежнага прафсаюзу ААТ «Горадня Азот» **Сяргея Антусевіча** наконт законнасьці пагалоўнай кантрактызацыі. Сябры АГП **Аляксандар Бяспалы** і **Ўладзімер Казак** былі затрыманыя пры раздачы ўлётак «Пяцёркі плюс» каля прахадной Менскага заводу колавых цягачоў. 9 красавіка ў Менску падчас расклейкі ўлётак былі затрыманыя актывісты «Зубра» **Раман Казакевіч, Канстанцін Л.**, непаўналетні **Алег Радзюк**. У Баранавічах актывіста «Зубра» **Артура Гайдукевіча** затрымалі і склалі пратакол за «выкарыстаньне незарэгістраванай сымболікі»: хлопец меў лягатып арганізацыі на вопратцы. 12 красавіка ў Полацку з улёткамі былі затрыманыя і асуджаныя за дзейнасьць ад імя незарэгістравнай арганізацыі актывісты «Зубра» **Мікіта Сасім** (штраф 190 тыс.руб.), **Настасься Васіленка** і **Яўген Афнагель** (абое атрымалі судовыя папярэджаньні). 12 красавіка газэта **«Народная воля»** атрымала ліст ад дзяржаўнага інфармагенцтва БелТА з пагрозай суду, калі да 15 красавіка выданьне не аформіць дамовы на распаўсюд тэлепраграмы. Актывістка барысаўскай філіі «Зубра» **Алена Бычкова** 13 красавіка атрымала 95 тыс.руб. штрафу паводле арт.143 КаАП («Антысанітарыя») за расклейку ўлётак.

АШ

Узбоч вялейскага Леніна на цэнтральным пляцы прадаюць іконы

PHOTO.BYMEDIA.NET

У Вялейцы ўсё па калейцы

У той час, калі ў Менску віруе палітычнае жыцьцё, правінцыя па-ранейшаму сьпіць сабе непрабудным сном. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова наведаць які-небудзь невялікі горад — ну напрыклад Вялейку.

Цэнтар жыцьця Вялейкі — яе цэнтральны пляц імя Леніна. Тут і помнік правадыру, які так ніхто і не адважыўся прыбраць, і будынкі мясцовых уладаў, і два храмы — Крыжаўзьвіжанскі касьцёл і царква Сьвятой Марыі Эгіпэцкай, перабудаваная з касьцёлу пасьля паўстаньня Каліноўскага.

Дарэчы, у Беларусі вельмі шмат такіх дробных цэркваў, пабудаваных у 1863—64 г. у гонар здушэньня паўстаньня. І захаваліся нават пісьмовыя пацьверджаньні такіх уганараваньняў.

Вілейскія кінатэатар і Дом культуры на выходных канкуруюць між сабою ў прыцягненьні мясцовай моладзі на дыскатэкі. З 14 сакавіка непаўналетнім іх можна наведваць толькі да 23 гадзін. Кажуць, што адна зь мясцовых актывістак БРСМ нават сышла з арганізацыі, даведаўшыся пра гэты «загад прэзыдэнта». У Доме культуры ў красавіку чакаюцца дзьве вялікія падзеі: прыезд «Песьняроў» і тэатру «Хрыстафор», які сьвяткуе сваё 15-годзьдзе турам па краіне.

Горад збольшага дэпалітызаваны, і цяпер ужо цяжка паверыць, што ў 1994 г. тутака на выбарах перамог Пазьняк. Але пры гэтым на фоне суседняга Мядзелскага раёну, зь якім Вялейшчына злучаная ў адну выбарчую акругу на сёлетніх парлямэнцкіх выбарах, раён выглядае няблага. Там, на Нарачы, няма ні прадстаўніцтваў апазыцыйных партыяў, ні мясцовых НДА — спрыяльная глеба для праўрадавых кандыдатаў, якім зручна выкарыстоўваць рэгіянальны патрыятызм мядзелцаў. У Вялейцы ж існуюць раённыя арганізацыі партый БНФ, АГП і ПКБ, свабодных прафсаюзаў, шэраг няўрадавых арганізацыяў. Вось толькі зь людзкім рэсурсам праблема: адны і тыя ж людзі займаюцца і ў партыях, і ў некалькіх арганізацыях адначасова. На жаль, сытуацыя не ўнікальная па сваёй сутнасьці.

Блытаніна пакуль у рэгіёне і з адзіным кандыдатам ад каліцыі «Пяцёрка Плюс». На афіцыйнай прэзэнтацыі кааліцыі такім быў абвешчаны старшыня Вялейскай арганізацыі АГП, супрацоўнік «Райаграсэрвісу» **Ўладзімер Малярчук**. Але на дадзены момант разглядаецца таксама кандыдатура настаўніка гісторыі другой вялейскай гімназіі **Язэпа Мацюна** з ПКБ, які ўжо двойчы ўдзельнічаў у парлямэнцкіх выбарах. Пакуль беспасьпяхова. На апошніх выбарах у мясцовыя саветы яму ўдалося-такі атрымаць дэпутацкі мандат. Апроч яго, гэта ўдалося толькі **Сяргею Клімёнку** з усё той жа АГП. Астатнія дэмакратычныя кандыдаты, нават набраўшы найбольшую колькасьць галасоў, мандатаў не атрымалі праз тое, што выбары ў іх акругах былі прызнаныя несапраўднымі.

У горадзе распаўсюджваюцца дзьве зарэгістраваныя мясцовыя газэты: беларускамоўная **«Рэгіянальная газета»**, што выдаецца ў Маладэчне, і мясцовы **«Шлях перамогі»**, дзяржаўная «раёнка» на беларускай і расейскай мовах. Якасьць апошняй ужо даўно стала аб'ектам жартаў і кпінаў: кепска пададзеныя матэрыялы, архаічнае макетаваньне, даўжэзныя, на паўстаронкі, загалоўкі. Апроч таго, існуюць яшчэ нерэгістраваныя выданьні. Адно зь іх, скаўцка-моладзевая газэта **«Лілея»**, ужо пасьпела стаць досыць папулярнай сярод моладзі. Выдавец **Віталь Паўлоўскі** спадзяецца ператварыць «Лілею» ў пасьпяховы бізнэс-праект. Газэта на гістарычныя тэмы **«Волат»**, якой актыўна займаецца старшыня Вялейскай арганізацыі БНФ **Аляксей Сюдак**, выдаецца зусім нядаўна, але ж і яна выклікала пэўную цікавасьць сярод маладых вялейцаў. Свабодны прафсаюз выдае на дзьвюх мовах грамадзка-палітычны бюлетэнь **«Аб'ектыў»**, які распаўсюджваецца сярод працоўных дзяржаўных прадпрыемстваў гораду.

У астатнім жыцьцё гораду мала чым розьніцца ад жыцьця любога іншага правінцыйнага места. Як і паўсюль, тут заганяюць працоўных на кантракты, а моладзь — у БРСМ, ліквідуюць прыватныя маршруткі і беларускамоўныя клясы ў школках, масава скарачаюць працоўныя месцы на дзяржпрадпрыемствах і душаць паборамі прадпрымальнікаў. А людзі, як і паўсюдна, цярпліва трываюць усе гэтыя зьдзекі ды жывуць цэнамі на гарэлку ды кілбасы.

Зьміцер Казлоўскі, Вялейка

Барань падновяць, на чарзе — Балбасава

Пачаліся працы па добраўпарадкаваньні спадарожніка Воршы — гораду Барань. З розных дзяржаўных крыніцаў на іх выдаткуюць 3 млрд 325 млн рублёў. Для параўнаньня: летась на добраўпарадкаваньне мястэчка Копысь Аршанскага раёну, дзе нарадзіўся А.Лукашэнка, спатрэбілася звыш 8 млрд, пры тым, што ў ім жыхароў у 20 разоў меней, чым у Барані. Плянуюць адрамантаваць фасады й дахі 28 шматкватэрных дамоў, 3 школ, мэдустаноў, Палацу культуры і г.д. Да працы будуць прыцягнутыя беспрацоўныя месьцічы (у адрозьненьне ад Копысі, дзе ўсё рабілі будаўнікі-«варагі»). Гэта важна, бо горадабудаўнічае прадпрыемства РУП «Лёс» — былы радыёзавод саюзнага значэньня — ніяк ня выйдзе з крызысу. За апошнія гады колькасьць работнікаў на ім скарацілася з 8 да 1,5 тысячаў.

Абнаўленьне будзе весьціся шпаркімі тэмпамі, бо пры канцы траўня сюды зьбіраецца прыехаць прэзыдэнт. Як заўсёды ў такіх выпадках, пра якасьць будаўніцтва ды рамонту гаварыць не даводзіцца. Чакаюць А.Лукашэнку і ў суседнім гарпасёлку Балбасава, таксама спадарожніку Воршы. Былы вайсковы гарадок пасьля выводу адсюль у 1994 г. у Расею палка стратэгічных бамбавікоў прыйшоў у поўны заняпад. Шмат якія збудаваньні стаяць бяз вокнаў і дзьвярэй, зь дзіравымі дахамі. Працягваюць красьці ўсё, што можна, з былога аэрадрому: ня толькі кабэлі з каляровых мэталаў, але нават бэтонныя пліты. Як і ў Барані, тут шмат беспрацоўных, што ніяк не спрыяе нармальнаму сацыяльна-эканамічнаму разьвіцьцю досыць буйнога мястэчка. З уступленьнем у NATO нашых прыбалтыйскіх суседзяў некаторыя былыя вайскоўцы, якіх тут засталося шмат, мараць, каб на балбасаўскі аэрадром ізноў вярнуліся расейскія стратэгічныя бамбавікі. Праўда, каб аднавіць усю інфраструктуру вайсковай базы, спатрэбяцца вялікія фінансавыя сродкі й намаганьні. Хацелася б, каб іхныя мары так і засталіся марамі.

Першая ахвяра кантрактнай сыстэмы

Загадчык аршанскага мэмарыяльнага музэю Канстанціна Заслонава Ўладзімер Багамазаў адмовіўся падпісаць кантракт з дырэктарам музэйнага комплексу «Гісторыя і культура Аршаншчыны». У адпаведнасьці з дэкрэтам прэзыдэнта, Багамазаў быў звольнены. Ён адпрацаваў на пасадзе 15 гадоў, зьяўляецца добрым знаўцам апошняе вайны, аўтарам некалькіх кнігаў. Да таго ж, 55-гадовы былы вайсковец — «аўганец», старшыня мясцовай філіі Беларускага саюзу афіцэраў. Праўда, у Багамазава ня склаліся адносіны з адміністрацыяй створанага ў 1994 г. музэйнага комплексу, у склад якога ўваходзяць пяць музэяў. Цяпер жа для звальненьня незадаволенага падначаленага шукаць нейкіх важкіх падставаў не было патрэбы. Такім чынам, ахвярай кантрактнай сыстэмы, уведзенай А.Лукашэнкам, стаў не дысыдэнт-апазыцыянэр, а адданы прыхільнік існага палітычнага рэжыму. Можа, на аднаго апазыцыянэра паболее?

Яўген Жарнасек, Ворша

Зубры патравілі азіміну

Восем мільёнаў рублёў штрафу прысуджана двум прадпрыемствам за шкоду, што нанёс калгасу «Чырвоны ўдарнік» статак зуброў. Пры канцы восені статак зуброў (47 галоў) зьнішчыў прыкладна 120 га азімых. Гаспадарка зьвярнулася ў суд з пазовам на 12 млн рублёў. Адказнасьць была ўскладзеная на Асіповіцкі досьледны лясгас і Жорнаўскую экспэрымэнтальную лясную базу. Сума была зьменшаная на 4 млн руб.: суд палічыў, што калгас і сам не прыняў дастатковых мераў па абароне азімых. Існаваньне лясных волатаў ужо не адзін год прыносіць праблемы прылеглым да месца іх існаваньня сельскім гаспадаркам.

Рыгор Латышэвіч, Асіповічы

Царква зь людзкой кішэні

Згодна з пастановай райвыканкаму, кожны жыхар Круглага, які мае працу, павінен пералічыць на будаўніцтва разбуранага ў 50-я ваяўнічымі камуністамі-атэістамі праваслаўнага храму адзін дзённы заробак. Прадпрымальнікі абавязаныя ахвяраваць на высокія мэты па 50 тыс. рублёў, а кожны, хто працуе ў прыватным сэктары, — па 10 тыс. Хто будзе кантраляваць расходаваньне сабраных сродкаў — невядома. Пойдуць яны на будаўніцтва храму ці на заканчэньне эўрарамонту Дому саветаў, сказаць цяжка.

Зінаіда Мілешчанка, Круглае

Падробная «Санта»

У Цюмені (Расея) знайшлі падпольны цэх, які выпускаў ікру мойвы пад гандлёвым знакам берасьцейскага СП «Санта-Брэмар», паведаміла берасьцейскае прадпрыемства. Ікру ў крамах Цюмені скмеціў прадстаўнік «Санта-Брэмар» у Маскве. Падробкі заўважаныя і ва Ўкраіне. Ікра мойвы — недарагі, але карысны прадукт.

Беларускія самалёты парушылі прастору Расеі

Восем беларускіх паветраных караблёў працуюць… у Расеі на сельгасработах — у Курскім і Стаўрапольскім рэгіёнах. У самой Беларусі сёлета «кукурузьнікі» маюць апрацаваць хімікатамі каля трох тысяч кв. км палеткаў.

Жамчужніцы ня вернуцца

Да чэрвеня Міністэрства аховы прыроды зацьвердзіць новы сьпіс рэдкіх відаў. Ён будзе адпавядаць патрабаваньням Міжнароднага саюзу аховы прыроды, а таму зь яго выведуць 57 таксонаў. Сярод іх — дзьвюхстворкавы малюск жамчужніца (не рэгістравалася ў Беларусі апошнія 150 год), чырвонавальлёвая казарка (не гняздуецца і не спыняецца ў нас), гіганцкая вячэрніца (фіксаваўся адзін выпадковы прылёт гэтага кажана ў 30-я гады XX ст.), матылёк махаон, птушка варакушка (іх лічба стабільная паводле эўрапейскіх крытэраў), купальнік горны (пашыраны і ўстойлівы да антрапагенных нагрузак від).

МБ; БелаПАН

Японец Кляшчук

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Кляшчук ня толькі ведае на памяць самыя прыгожыя відарысы Беларусі. Ён ведае таксама, зь якога пункту агляду яны самыя харошыя. У якую пару краса кожнага зь іх выяўляецца найлепей. Больш за тое — у які момант сутак трэба глядзець на гэты відаль з гэтага найлепшага пункту.

Некаторыя нацыі ператварылі ўменьне ствараць, бачыць і разумець краявіды ў мастацтва. Як японцы з садам Раандзі ды Фудзіямай. У добрых турыстычных даведніках вы знойдзеце захапленьне непаўторнымі пэйзажамі Тасканы ці Бургундыі, Саксоніі й Мазураў. Ляндшафты ахоўваюцца або штучна падкрэсьліваюцца. У пунктах, адкуль адкрываюцца найлепшыя краявіды, стаяць самыя дарагія гатэлі, знакамітыя рэстарацыі. Магчымасьць спажыць вачыма каштоўны краявід — асалода, якая падкрэсьлівае смак страваў. Да нашага пачуцьцёва чэрствага народу такая рафінаванасьць пакуль не дайшла.

Краявід — гэта таксама вобраз краіны і знак. Прырода Расеі тысячааблічная, але што такое прырода Расеі для сьвету? Гэта бярозавы гай. Украіна? Гэта Дняпро, пшанічнае поле, Карпаты.

У савецкі час беларускім краявідам нумар адзін было гіганцкае поле, выраўнавананае, вычышчанае ад хмызоў у лагчынах і прысадаў вакол былых котлішчаў, ад уласьніцкіх межаў, парэзанае толькі правільнай сеткай мэліярацыйных каналаў, стэрылізаванае ад любых прыватнасьцяў дзеля зручнасьці для сельскагаспадарчае тэхнікі. Гэта быў трыюмф эканамічнае мэтазгоднасьці над прыродай, гісторыяй і псыхікай. Традыцыйны ляндшафт нішчыўся, і настолькі пасьпяхова, што ў замежнікаў, якія перасякаюць Буг на машыне і працягваюць свой шлях па менскай трасе, складваецца ўражаньне, што на іншым беразе яны трапілі ў іншае геаграфічнае асяродзьдзе. Вельмі трапна гэткае адчуваньне перадае жонка першага пасла Францыі ў Беларусі Ані Жаліф у сваёй кнізе ўспамінаў пра беларускія прыгоды, якая выйшла па-французску.

Іншым стэрэатыпам краявіду быў лес, дакладней, пушча — дрымучая, першабытная стыхія бязь сьледу чалавечае прысутнасьці, супрацьлегласьць калгаснага абшару.

У 90-х адбылося пераадкрыцьцё беларускага краявіду, іншага — больш камэрнага, прыватнага, антрапагеннага, з заўважнымі каранямі й межамі, правінцыйна элегантнага, бяз шалу постмадэрнізму — ляндшафту азёрнага, узгорыстага, каталіцкага (зь дзьвюхвежавымі сылюэтамі), фундамэнтальнага, які ня зблытаеш з краявідамі ніякай іншай краіны. І зрабіў гэтае пераадкрыцьцё сярод іншых фатограф Анатоль Кляшчук.

Будучы сутворцам гэтага краявіду ўвогуле, краявіду-клішэ, умеючы выяўляць яго бясконца і неманатонна (як Шагал — свае мястэчкі), Кляшчук застаўся пры гэтым гурманам краявіду для абраных, краявіду-архідэі, які цьвіце некалькі гадзін у год і не заўжды добра пахне, краявіду цяжкадаступнага, да якога не даедзеш на «фольксвагене». І гэта ўжо дасканалае японства. І найлепшы пуцяводнік для турыста.

Пад размытай вокладкай — няўдача афарміцеля Зьмітра Герасімовіча — хаваецца адзін з самых захапляльных альбомаў апошніх гадоў. Пераадкрыйце беларускі краявід і для сябе.

Андрэй Дынько

Анатоль Кляшчук. Пад небам Беларусі. — Менск: Беларусь, 2003.

Вясёлы прафэсар

На прэзэнтацыі кнігі «Беларуская літаратура дыяспары» Арнольда Макміліна 12 красавіка было весела. Аўтар нагадваў эксцэнтрычнага прафэсара з галівудзкай камэдыі, перакладчыкі кнігі Вера Бурлак і Віктар Жыбуль — сарамяжлівых студэнтаў гэтага прафэсара.

Брытанскі славіст Макмілін, працы якога даюць ангельскамоўным студэнтам магчымасьць вывучаць нашую літаратуру, дужа цешыўся, што ягоная кніга пабачыла сьвет «і па-беларуску, а ня толькі на мове прэзыдэнта Буша». Спачуваў перакладчыкам: «Перакладаць з ангельскай на беларускую вельмі цяжка — амаль як арганізаваць п'янку ў пустэльні». Казаў, што беларускую літаратуру ў сьвеце будуць ведаць тады, калі зьявяцца пераклады на ангельскую. Прычым перакладаць вершы бессэнсоўна: паэзія не перакладаецца.

Самі перакладчыкі наўзахапкі хвалілі кнігу, а В.Бурлак нават прапанавала яе ўзяць за аснову для падручніка. Рэцэнзію ў «Arche» №1'2004 на ангельскі варыянт сваёй кнігі Макмілін ня бачыў, як ня бачылі яе й перакладнікі.

Крытыкеса Ганна Кісьліцына запярэчыла: «Чаму мы ставім замежніка вышэй за сваіх? Хіба чатырохтамовая «Гісторыя беларускай літаратуры» горшая?». Макмілін адразу згадаў пра дырэктара Інстытуту літаратуры: «Вас Навуменка паслаў?..» Потым прызнаўся, што згаданага чатырохтомніка не чытаў, але пачытае, прызнаў кнігу самой Кісьліцынай вартай перакладу, а больш раньнія працы па беларускай літаратуры «ня вельмі цікавымі для замежнага чытача».

Былі й сур'ёзныя пытаньні, і ня менш сур'ёзныя адказы. На пытаньне, каго зь пісьменьнікаў другой паловы XX ст., апрача Быкава, варта выдаць акадэмічным поўным зборам твораў, Макмілін не вагаўся: «Караткевіча, Стральцова». Адзначыў, што ў Канадзе рыхтуецца да выданьня ангельскамоўная біяграфія Быкава. Наступная кніга прафэсара будзе прысьвечаная літаратуры 1970—2000 г.

Адам Воршыч

Гутарку з прафэсарам Макмілінам чытайце ў наступным нумары «НН».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Украінскія ўзнагароды Тарасаву й Кіштымаву

Беларускія гісторыкі Сяргей Тарасаў і Андрэй Кіштымаў атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды Украіны: Тарасаў — званьне «Заслужанага работніка турызму Украіны», а Кіштымаў — ордэн «Казацкай славы» III ступені. Узнагароды навукоўцам далі за навукова-дасьледчыя экспэдыцыі: разам з украінскімі калегамі яны тройчы хадзілі старажытнымі воднымі шляхамі на копіях даўніх караблёў — ладзьдзях і дракарах. Сёлета Тарасаў і Кіштымаў маюць прайсьці зь дзьвюма экспэдыцыямі: «Браціна-2004» (Бранск—Чарнігаў—Кіеў) і «Бурштынавы шлях» (ад Кіева праз Дняпроўска-Бугскі канал і Буг да Гданьску).

Зьмены ў рэпэртуары купалаўцаў

З рэпэртуару выключылі некалькі спэктакляў Малой сцэны: «Брат мой, Сіман», «Восеньская саната», «Дом, дзе сьпяць прыгажуні». Апошнія паказы гэтых пастановак пройдуць у красавіку. «Каварства і любоў» пераносіцца з Малой сцэны на Вялікую.

Марачкін у Горадні

13 красавіка ў галерэі «Тызэнгаўз» адкрылася выстава Аляксея Марачкіна «Мая Атлянтыда». У мастака даўняя лучнасьць са старажытным горадам. На пачатку 80-х дзякуючы яму і ягоным сябрам у музэй Горадні трапіла карціна Пётры Сергіевіча «Каліноўскі і Ўрублеўскі на аглядзе паўстанцаў». Гарадзенцы ж ведаюць Марачкіна па карцінах, якія знаходзяцца ў калекцыях гораду, — сэрыі «Паданьні й легенды Беларусі», партрэтах «Язэп Драздовіч», «Пачатак. Францыск Скарына». Гэтым разам мастак паказвае плён апошніх гадоў — як рэалістычна-фігуратыўныя палотны, так і творы абстрактна-мэтафарычныя.

Прыз за гісторыю Левіна

Фільм расейскага рэжысэра Аляксея Федарэнкі «Давід» атрымаў Гран-пры на V Міжнародных днях дакумэнтальнага кіно «Ростані Эўропы» ў Любліне. Фільм апавядае пра жыцьцё менскага жыда Давіда Левіна падчас другой сусьветнай. Другая і трэцяя статуэткі сьвятых Кірылы й Мятода, прызы фэстывалю, дасталіся полькам Ганьне Васьнеўскай (фільм «Кожны сэрб гэта Радаван?») і Вандзе Ружыцкай-Збароўскай (стужка «Рыцарская кроў»).

Ягелёнцы запрасілі

14—17 красавіка ў Кракаве з ініцыятывы Ягелёнскага ўнівэрсытэту адбываюцца Дні беларускай культуры. У праграме Дзён — вечарыны кіно й песьні. Гарадзенскі тэатар лялек мае паказаць у Кракаве «Тутэйшых», а Віктар Шалкевіч дае канцэрт.

Біблія — самая-самая

Нямецкае біблійнае таварыства падлічыла, што Біблія (цалкам ці часткамі) выдадзена на 2355 мовах народаў сьвету. У 2003 г., абвешчаным Міжнародным годам Бібліі, былі скончаныя пераклады на 52 мовы. Цалкам Сьвятое Пісьмо выдадзенае на 414 мовах, Новы Запавет — на 1068, а паасобныя кнігі Бібліі — на 873 мовах. Па-беларуску існуюць розныя пераклады Новага Запавету: Л.Дзекуць-Малея і А.Луцкевіча, Я.Станкевіча, В.Сёмухі, У.Чарняўскага.

Помнікі Ліндгрэн

Да 100-годзьдзя казачніцы, якое будзе адзначацца ў 2007 г., на ейнай радзіме ў мястэчку Вімэрбю (Швэцыя) зьявяцца два помнікі: скульптурная група «Крыніца» — каля таго месца, дзе стаяў дом яе дзяцінства, і статуя самой пісьменьніцы — на цэнтральнай плошчы. Акрамя таго, у мястэчку будзе Цэнтар А.Ліндгрэн. Па-беларуску з твораў пісьменьніцы перакладзеныя толькі «Браты Ільвінае сэрца» і «Ўсе нашыя дзеці з Булербю».

АВ; ІрМа, БелаПАН, Gazeta.pl

Канцэрт году

Вяртаньне Касі Камоцкай, абноўлены «Ўліс», Кулінковіч пабеларуску, «Крама» зь сьвежай праграмай, 30 кіляватаў гуку — на канцэрце «Генэралы айчыннага року».

Генэрал Кулінковіч і яго войска

25 красавіка Лядовы палац акупуюць музыкі. Вядзецца не пра таварыскую хакейную сустрэчу «Рок супраць папсы» ці нешта іншае такога кшталту. Канцэрт, які мае адбыцца, прэтэндуе на званьне найбуйнейшае рок-акцыі апошніх гадоў. Доўжыцца ён будзе аж чатыры гадзіны і зьбярэ каля дваццаці гуртоў. Агульная магутнасьць апаратуры дасягне 30 кіляватаў — такім гукам можна зруйнаваць які-небудзь невялікі ДК.

Канцэрт году будзе складацца з трох частак. Мэта першай, паводле словаў Зьмітра Дайнэкі, што прадстаўляе фундатара акцыі, кампанію «БелПі», — патрэніраваць маладых беларускамоўных музыкаў. Каб упэўнена пачуваліся на прафэсійнай вялікай сцэне. Праз галасаваньне на сайце «Тузін гітоў» (www.music.fromby.net) былі абраныя сем групаў, што возьмуць удзел у канцэрце, — «БН», «Гарацкія», «Partyzone», «Znich», «Куклы», «Сьцяна», «Тэзаўрус». Шляхам глядацкага галасаваньня падчас фэсту (анкеты будуць раздаваць на ўваходзе) вызначаць тры найлепшыя зь іх. За першае месца арганізатары абяцаюць маладому гурту бясплатны запіс альбому, за другое — прафэсійна зьняты кліп, за трэцяе — дарагі студыйны мікрафон.

Пасьля маладых на сцэне адыграюць госьці фэсту — прадстаўнікі розных стылёвых плыняў беларускай музыкі. Сярод іх фолькавы «Стары Ольса», блюзавы «P.L.A.N.», гардкоравы «Zet», падзабыты ўжо «Żygimont VAZA».

Трэцяя частка канцэрту — выступ генэралаў, легендаў айчыннай рок-музыкі. Кожны гурт рыхтуе сюрпрыз. Так, «Нэйра Дзюбель» прэзэнтуе нарэшце цалкам беларускамоўную праграму «Tanki». Кулінковіч таксама пераклаў на беларускую мову гіт «Belarus uber alles». Будзе «Крама» з новай праграмай «Бывай, мая Радзіма».

Вернецца на сцэну Кася Камоцкая, каб прасьпяваць старыя гіты «Новага Неба». Толькі вось выступаць яна будзе хутчэй за ўсё сольна.

Для «Ўлісу» гэты канцэрт будзе разьвітаньнем з бубначом Аляксандрам «Гансам» Быкавым, што працаваў у гурце 10 гадоў. Ганс мяркуе засяродзіцца на «Крамбамбулі». Слава Корань не выключае, што да гурту далучыцца клявішнік ці ды-джэй — «Уліс» выпраўляецца ў чарговую вандроўку, на пошукі новага гучаньня. «NRM» гэтым канцэртам скончыць беларуска-польска-расейскае турнэ. Упершыню ў гэтым годзе можна будзе пабачыць «Крыві», якіх таксама залічылі да генэралаў.

Шкада, што ня спраўдзіліся надзеі хоць на чатыры гадзіны адрадзіць легенды 80—90-х: «Бонду», «Мясцовы час» ды «Мрою». Арганізатар канцэрту Віталь Супрановіч кажа, што самі ўдзельнікі тых гуртоў ня надта зацікаўленыя ў паўставаньні з попелу перабудовы. Вакаліст «МЧ» Алесь Кузьмін за мяжой, Вольскаму няма калі, а Варашкевіч задумаў паралельна з «Крамай» праект «Цмок і малое» — навошта згадваць старое... Тым ня менш на дыску «Генэралы айчыннага року», які прэзэнтуюць на аднайменным канцэрце, песьні легендарнае тройцы будуць. У складанку ўвойдуць таксама вядомыя і новыя творы «таварышаў генэралаў» і малодшых чыноў.

Дыск у падарунак атрымае той, хто набудзе квіток за 20 тысячаў. Найтаньнейшыя квіткі ў бакавыя сэктары залі каштуюць 8 тыс., танцпол — 10 тыс.

Канцэрт у Лядовым, што на вул. Прытыцкага, 27 (ст.м.«Пушкінская»), — гэта пробны шар. Калі ён пройдзе пасьпяхова, калі зьбярэ тры тысячы прыхільнікаў, — зробіцца рэгулярным. Гэткім «Басовішчам» і «Рок-каранацыяй» у адным фляконе. Вытрасайце гаманцы, фанаты: наш рок варты такога фэсту.

Сяргей Будкін

Паэткі выйгралі без суду

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Дыяна Балыка: «Я належу гэтай краіне».

Паэткі Марына Куноўская, Вольга Роўная і Дыяна Балыка падалі ў суд на Анатоля Аўруціна, укладальніка зборніку «Сучасная расейская паэзія Беларусі», а таксама выдавецтва «Тэхнапрынт». Асноўная прэтэнзія — парушэньне аўтарскіх правоў: іх вершы паставілі ў анталёгію бяз згоды аўтарак. Паэткі таксама настойваюць на тым, што належаць не да расейскай паэзіі, а да беларускай расейскамоўнай.

«Мая культурная і чалавечая прыналежнасьць — гэтай краіне. Я валодаю беларускай мовай, я скончыла беларускамоўнае аддзяленьне гістфаку БДУ, зьбіраюся ўступіць у Саюз беларускіх пісьменьнікаў. Пры публікацыях у расейскіх, украінскіх альманахах я стаўлю ўмову, каб пазначалі, што я зь Беларусі, зь Менску», — патлумачыла ў камэнтары «НН» Д.Балыка. Паэткі настойваюць на моўнай разнастайнасьці Беларусі й згадваюць як прыклад Міколу Гусоўскага, які пісаў на лаціне.

Справа скончылася 12 красавіка на стадыі дасудовага разгляду: адказчыкі пагадзіліся выплаціць кожнай з аўтарак па 190 тыс.руб. (10 базавых велічыняў — мінімальная кара, пазначаная ў заканадаўстве пра аўтарскія правы), хаця самі паэткі сьпярша настойвалі на 250 тыс. руб.

Д.Балыка задаволеная вынікамі: «Спадзяюся, гэтая справа навучыць выдаўцоў дбаць пра аўтарскія правы. Калі б з намі заключылі дамовы, дык ім давялося б плаціць значна менш — 10 даляраў, а не 100, бо ганарары за вершы ў Беларусі вельмі нізкія».

Аркадзь Шанскі

Без вайны і вёскі

У кніжку «12+1. Конкурс маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай» ўвайшлі творы ляўрэатаў конкурсу, зладжанага летась Беларускім ПЭН-Цэнтрам. Бальшыня аўтараў дэбютавала на старонках «НН». Іх творчасьць паказвае, што ў беларускай літаратуры нарэшце скончылася вайна і амаль скончылася вёска.

Косава бачыць

На Дзень Волі, на гэтае сьвята блакітнага неба, мокрага ветру й надзеі на перамены, заўсёды чакаем ад лёсу нейкага знаку. Знаку, які б прадказваў зьмены да лепшага і натхняў на перамогі. Але часьцей лёс падае знакі таго, што трэба быць падрыхтаваным да цяжкасьцяў, не зважаць на паразы й перашкоды ды імкнуцца далей, даводзячы ўсім, што Беларусь — жыве.

Такім знакам зьявіўся вялізны крыж, які берасьцейскія маладафронтаўцы ўсталявалі ў гонар паўстанцаў Касьцюшкі напярэдадні Дня Волі (24 сакавіка якраз мінула 210 гадоў з паўстаньня 1794 г.).

На гэтую акцыю ў Косава берасьцейцы запрасілі менскіх «калегаў», якія прыехалі надзвычай шматлікім складам. Да прыезду менчукоў берасьцейцы трохі прыбралі палац Пуслоўскіх, што каля сядзібы Касьцюшкаў. Дарэчы, сама сядзіба цяпер будуецца нанава адпаведна выгляду старой, сапраўднай (цікава, што будаўнікі выкарыстоўваюць тагачасныя тэхналёгіі — нават паміж дошкамі кладуць мох, як рабілі майстры ў тыя часы). Што да самога палацу, то знаходзіцца ён у жахліва занядбаным стане. Захаваўся добра, але ж аматары адпачынку «на натуры» папсавалі. На сьценах няма жывога месца — спрэс сьпісаныя ды размаляваныя, а ўнутры ажно хрумсьціць пад нагамі ад бітага шкла і сьмецьця. Маладафронтаўцы пазьбіралі ў палацы й навокал бітыя бутэлькі, кансэрвавыя бляшанкі ды іншыя сьляды «культурнага адпачынку», падрыхтавалі яміну для крыжа, які меўся быць усталяваны па прыезьдзе менчукоў.

Але ж калі ля палацу сабралася даволі вялікая кампанія, больш за семдзесят чалавек, у самы адказны момант зьявілася прадстаўнічка гарсавету, папытала, у чым рэч, і паведаміла, што крыж ставіць ня трэба: паляна перад палацам павінна баранавацца і крыж будзе замінаць. І ўвогуле, валанцёрства справа добрая, а вось крыжоў ніякіх ня трэба.

Але крыж усё-такі заняў сваё належнае й пачэснае месца, па чым мелі слова прадстаўнікі БНФ і маладафронтаўцы зь Менску. Пасьля да прысутных зьвярнуўся арганізатар акцыі Сяржук Бахун (чыімі высілкамі быў набыты крыж) і падзякаваў усім за ўдзел. Прасьпяваўшы «Магутны Божа», народ паціху пачаў разыходзіцца.

А пяцімэтровы крыж застаўся самотна стаяць паміж занядбаным палацам і недабудаванай сядзібай пад шэрым і цяжкім небам. Помнік паўстанцам 1794 г., якія мужна змагаліся за Радзіму.

На наступны дзень, 25 Сакавіка, мясцовы гарсавет паведаміў, што крыж будуць зносіць у сувязі з работамі, якія маюць правесьці знадворку палацу. Цікава толькі, чаму ж вырашылі так рупліва й тэрмінова ўзяцца за гэтыя работы адразу пасьля ўсталяваньня крыжа ў гонар паўстанцам Касьцюшкі? Знак лёсу?

Ганна Зьнічка, Берасьце

Глыбачане не пайшлі на «бангалор»

Ужо колькі гадоў запар мясцовым апазыцыянэрам улады не дазваляюць правесьці пікет у цэнтры гораду. Ім выдзелілі плошчу на ўскраіне, каля гарадзкога Дому культуры, якую апазыцыя назвала глыбоцкім «бангалорам». Пікет той маглі бачыць за гадзіну чалавек дзесяць, таму сёлета на Дзень Волі яго не праводзілі. Замест гэтага было вырашана папросту разьдзяліцца і прайсьці па цэнтральнай вуліцы, каб павіншаваць мінакоў з Днём Волі, уручыць бел-чырвона-белыя сьцяжкі й каляндарыкі. Шмат хто зь мінакоў ня ведаў пра гэты дзень, але ніхто не адмовіўся ад сьцяжка. Наадварот, людзі дзякавалі за віншаваньне, пры гэтым адразу пераходзілі на беларускую мову. Правяла акцыю глыбоцкая моладзь на чале з кіраўніком мясцовай арганізацыі БНФ Яраславам Берніковічам.

Зьміцер Лупач, Глыбокае

Дзякуем Абрамавай

2002 год увойдзе ў гісторыю Нова-Сьвержанскага лесазаводу, філіі ААТ «Лесдрэўпрам», як год вялізных узрушэньняў. У студзені кіраўніцтва звальняе дырэктара, які прапрацаваў на гэтай пасадзе 16 гадоў. Замест яго ставяць нейкага Грыневіча А.С. З чаго пачынаў Грыневіч? За няпоўны год звольніў шмат працаўнікоў, спыніў цэхі, кацельню.

Кіраўніцтва ААТ «Лесдрэўпрам» практычна ўсе свае акцыі ў лютым 2002 г. прадае нейкай фірме «Белцяжмаш». Былы генэральны дырэктар ААТ Сьцепаненка В.С. атрымлівае партфэль у міністэрскай структуры («Беллеспаперапрам»), а Грыневіч — прыстойную пасаду з добрым акладам у Бабруйску.

Некаторыя людзі спрабавалі супрацьстаяць гэтаму, але ўсе яны апыналіся за варотамі прадпрыемства. І куды мы толькі ні зьвярталіся — скрозь адныя адпіскі, што, маўляў, усё законна. Як дзяцей карміць? Працаўладкавацца ў маленькіх Стоўпцах, ды яшчэ з такім кляймом «паклёпнікаў», практычна немагчыма.

Дзякуй, знайшлася хоць адна добрая душа, якая не паставілася абыякава. Гэта дэпутатка палаты прадстаўнікоў Абрамава Вольга. Да яе зьвярнуліся ўжо ад безнадзейнасьці, ня ведаючы, да якога берагу прыбіцца. Гэтая мужная жанчына прыяжджала да мяне на суд, дамаглася аднаўленьня мяне на заводзе, паводле фактаў незаконнага ўзбуджэньня крымінальных справаў зьвярталася і да міністра ўнутраных спраў, і да начальніка следчага камітэту, і да генэральнага пракурора.

Цяпер у нас зьявілася надзея. Абяцаюць, што завод будзе перададзены ва ўласнасьць дзяржавы. А людзі зноў атрымаюць працу. Вельмі будзем спадзявацца. А Вользе Абрамавай праз вашу газэту хочацца перадаць вялізны дзякуй за ўдзел, спачуваньне і дапамогу ды пажадаць ёй добрага здароўя і сіл. Каб усё гэта пераадолець. Незалежна ад таго, як складзецца наш лёс.

Алена Сянкевіч, Стоўпцы,
адпрацавала на заводзе 18 гадоў

Дай забойцаў і маньякаў

Супрацоўнікі чытальнай залі й абанэмэнтнага аддзелу цэнтральнай гарадзкой бібліятэкі Слуцку задаліся мэтай вызначыць дзясятку аўтараў, творы якіх у мінулым годзе карысталіся найбольшым попытам у чытачоў, якіх сюды наведваецца штодня не адна сотня. І былі зьдзіўлены і шакаваны вынікамі падведзенага рахунку. На першае і другое месцы паводле попыту выйшлі сучасныя «модныя» расейскія пісьменьніцы Дар'я Данцова і Паліна Дашкава, якія працуюць у жанры іранічнага дэтэктыву. Іх раманы «Басэйн з кракадзіламі», «Несакрэтныя матэрыялы, альбо Забойцы і маньякі», «Лёгкія крокі бяздумства», «Маньякі-забойцы» зачытваюцца, як кажуць, да дзірак. Хоць і выдаюцца з так званай камэрцыйнай паліцы за плату — 500 рублёў на тры дні. За Данцовай і Дашкавай па чытабэльнасьці «крочаць» аўтары фантастычных і любоўных раманаў з старонкамі эротыкі і сэксу — Нік Пярумаў, Даніэла Стыл, Бэатрыс Смол, Сыдні Шэлдан і іншыя. Затое ў гэтым сьпісе (і блізка каля яго) ня значыцца ніводнага твору вядомых пісьменьнікаў-клясыкаў, ня кажучы ўжо пра паэтаў. На іх «кідаюць» вока хіба што вучні старшых клясаў — па вучэбнай праграме.

Два гады таму адміністрацыя бібліятэкі перастала выпісваць на абанэмэнцкі аддзел часопісы «Полымя» і «Маладосць» (у чытальную залю яны паступаюць па-ранейшаму) з той прычыны, што на іх зьвярталі ўвагу толькі... два чалавекі: мясцовы журналіст і адзін пэнсіянэр. На прапановы супрацоўнікаў аддзелу пазнаёміцца зь сьвежымі нумарамі гэтых часопісаў ня толькі маладыя, а і сталыя людзі, сярод якіх нямала настаўнікаў, грэбліва махалі рукой, маўляў, адчапіцеся.

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

Беларусь – гэта не Расея ўзімку

Беларусь — новая і невядомая краіна Эўропы. Каб прыцягнуць да яе эканамічную ўвагу, ураду трэба змагацца з процьмай такіх жа малавядомых суседзяў-канкурэнтаў. Тыповы заходні бізнэсовец блытае Латвію зь Літвой, а Славаччыну — з Славеніяй. Расейская мова беларускай улады дурыць галаву заходняму спажыўцу, ён пачынае думаць, што Беларусь — гэта правінцыя Расеі. Адзін вядомы швэдзкі журналіст так і напісаў: «Беларусь/Vitryssland» — гэта «Расея ўзімку». З прычыны русіфікацыі дзелавой дакумэнтацыі і сайтаў пасольстваў Беларусі ў Эўропе, многія эўрапейцы зьбіраліся наведаць Беларусь... па расейскай візе. Сёньня анкеты і іншая консульская інфармацыя большасьці амбасадаў робіцца зноў па-беларуску і па-ангельску. Пытаньне зьнікла само сабой.

У сьвеце катастрафічна занепадае беларусістыка і цікавасьць да Беларусі — апрача паліталягічнай праблематыкі. На фоне адкрыцьця новых цэнтраў украіністыкі, у заходніх унівэрсытэтах зьнікаюць апошнія беларускія штудыі. З добрай сотні заходніх беларусістаў, якія бралі ўдзел у міжнародным кангрэсе 1995 г., засталіся адзінкі. Большасьць пераключылася на ўкраіністыку ці русістыку.

Ва ўсім сьвеце спэцыялісты па замежных краінах рыхтуюцца на спэцыяльных катэдрах. Зрабіўшы адзінай дзяржаўнай мовай украінскую, урад нашага суседа аўтаматычна забясьпечыў падрыхтоўку замежных спэцыялістаў і рост зацікаўленасьці да краіны ў інтэлектуальных колах Захаду і Ўсходу. Кожны бізнэсовец ведае, што ў Кіеве можна дамовіцца па-расейску, але ўся дзелавая інфармацыя толькі па-ўкраінску, 72% шкаляроў вучацца на роднай мове. Таму трэба вывучаць украінскую мову.

Швэцыя нядаўна адчыніла дзьве ўнівэрсытэцкія катэдры ўкраіністыкі. Перадусім гэтыя катэдры праз арганізацыю канфэрэнцый, навуковы ды папулярны друк на швэдзкай мове робяць добрую рэкляму малавядомай калісьці краіне. Тут вучацца і асьпіранты-швэды, якія выбралі ўкраіністыку (мову, палітыку, эканоміку) сваёй будучай прафэсіяй. Пасьля вучобы яны будуць шукаць і знойдуць працу па спэцыяльнасьці. Менавіта гэтая група новай эўрапейскай эліты будзе лякаматывам эканамічных адносінаў Эўразьвязу з Украінай. Так рухаецца сьвет.

У той самы час у Швэцыі адсутнічае магчымасьць вывучаць беларускую мову. Гэта адзіная славянская мова, не рэпрэзэнтаваная ў краіне. Чаму? Адказ швэдзкіх палітыкаў просты і прагматычны: у Менску ўсё па-расейску. Гэта значыць, што на доўгую пэрспэктыву ў Швэцыі, як і ў іншых краінах Эўропы, ня будзе спэцыялістаў па Беларусі, бо краіна вывучаецца толькі разам з мовай. Ва ўрадавыя і бізнэсовыя структуры на пасады спэцыялістаў па Беларусі (дыпляматаў ці кансультантаў) прызначаюцца гадаванцы катэдраў русістыкі, якія нічога ня ведаюць пра Беларусь. Менавіта гэта шмат у чым вызначае кволую дынаміку эканамічных стасункаў.

Беларуская мова — адзіная, не прэзэнтаваная на цэтліках і інструкцыях тавараў заходніх кампаній. Між тым гэта вялікі бізнэс ня толькі для перакладчыкаў, але і для дзяржавы. Бо паважаныя сусьветныя кампаніі замаўляюць пераклады ў краіне паходжаньня. Сёньня беларускія перакладчыкі нясуць вялікія страты, а дзяржава выдаткоўвае значныя грошы, бо ўвесь пераклад для экспартных тавараў у Беларусь робіцца па-расейску ў Маскве. Адтуль жа буйныя заходнія кампаніі запрашаюць перакладчыкаў для кансультацыі зь Менскам.

Усё сапраўды цікавае і жывое (літаратура, рок, гістарычная навука, журналістыка і аналітыка) ствараецца ў Менску па-беларуску. І гэта доўгатэрміновая гістарычная тэндэнцыя. На думку Ларысы Геніюш, зьнішчальная ў дачыненьні да роднай культуры цывілізацыя «абы кілбасы» — шлях у нікуды. На посткаляніяльнай мэнтальнасьці не пабудуеш дабрабыту. Паглядзіце, што робіцца ў англамоўнай ці франкамоўнай Афрыцы. Лёгіка тут простая. Правінцыя ніколі не жыве лепш за цэнтар. Беларуская мова аўтаматычна рухае краіну ў цэнтар з усімі пазытыўнымі наступствамі. Іншых рэцэптаў я ня ведаю.

Андрэй Катлярчук, Стакгольм

МОВА-2004

Łučak i šruba

Pan Skirhajła prydumaŭ słovy «**ŭtor**» i «**ŭtoryna**». Dobryja słovy. Dy nie zusim. Spałučeńnie hukaŭ «ut» nie charakternaje dla biełaruskaj movy. Da prykładu, «utorak» śpieradu prykryvajecca hukam «a» — «aŭtorak». Tak jamčej.

A voś Kaściukievičavy «**tyčka**» z «**łyčkaj**» padkazali mnie, jak nazvać adno łučvo elektryčnaha łancuha. Znachodzicca jano na ścianie pobač z łyčkaju. Byłaja nazva «vyklučalnik» nie mahła «ŭklučyć» śviatło, a «ŭklučalnik», adpaviedna, — vyklučyć. A słova «**łučak**» i «ŭłučaje», i «vyłučaje».

I jašče pra słova «**šruba**». U našaj miascovaści (vioska Mikieleŭščyna Mastoŭskaha rajonu) šrubaju nazyvajecca hajka. U nas na bołt nakručvajuć šrubu. Vy ž na svaich staronkach zhadvajecie, što akademičnyja słoŭniki «šrubaj» nazyvajuć vint i šurup. Heta reža mnie vucha. Choć ja i nia suprać nazvy, aby «šruba» zastavałasia ŭ movie. Ale raptam naša vioska nie vyklučeńnie i čytačy «NN» ź jinšych miascovaściaŭ paćvierdziać, što «šruba» maje zusim supraćlehłaje značeńnie? Tady treba być aściarožniejšymi z hetaj «šrubaj». Adhukniciesia, čytačy!

Henik Łojka, Miensk

Корат, суцяг і хагас

Плюс мовы, як для мяне, у выкарыстаньні скаротаў. Наступленьне — наступ, заяўленьне — заява. Чаму б не працягнуць? Забруджваньне — **забруда**, захоўваньне — **захова**. Можна і больш радыкальна: фантастыка — **магра** (магчымая рэчаіснасьць), сфэра — **выпа** (выпуклая паверхня), фабрыка — **тужня** (саматужны — не фабрычны). На прапанаваныя словы: пробка электрычная — **корат** (корак + дрот; спрацоўвае, калі каратне); калодка злучальная — **суцяг** (цяг — провад, су — разам); кораб канальны — **рул**, **рулка** (ад руля, рукаў); зьмяшальнік вады — **хагас** (халодная, гарачая сумесь); патрон лямпачкі — **закля** (зак — закручваць, ля — лямпачка); замочная шчыліна — **зашчыля**. Пры канцы — словы, якія чуў ва ўжытку, але мо або не пашыраныя, або падзабытыя, хоць і фіксуюцца слоўнікамі: колавая шына — апона; колавая камэра — кіха; даволі даўно — цеперся; казаба — няўжо; разьбязулець — расьпесьціцца, расхадзіцца, раздурэцца; раскепіўся — расьсеўся; ныкаць — шныпарыць; міталем — хуценька.

Мікола Максім, Рагачоў

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

ВОДГУК

Ад «бураціны» да «званочка»

Навошта вам было друкаваць артыкул «Ад «бураціны» да «званочка» ў «НН» №12? Я б сказала, што гэта поўная лухта. Можна было б назваць «наівам», каб не было так пошла, вульгарна, «зьверху ўніз» (у адносінах да мужчын), па-кухоннаму, па-школьнаму, з нацягнутым невядома куды гумарам.

Паглядзім на прыклады недарэчнасьцяў. «…на Нямізе выкінулі файнюткія шкорыкі». Як вам гэтае спалучэньне — «файнюткія... выкінулі»? Выкінулі клясныя/крутыя — яшчэ о'кей.

Дый такая спажывецкая клясыфікацыя ў вашых чытачоў 100% ня выкліча пазытыўнае рэакцыі (у адрозьненьне ад артыкулу Тэды Лі). І наколькі вульгарныя азначэньні («акучваць», «ахамутаць», «быкі» і «цёлкі» — дзіўлюся, чаму заадно не патлумачылі слова «трахацца»). Або з пошленькім хіхіканьнем (жанацік, лыцар, папік), або надзвычай банальна (ма́ча, прынц).

Кацярына Ягела, Менск

Музэй рэзыстансу

Зьвяртаюся да чытачоў «НН» і ўсіх шчырых беларусаў з просьбаю дапамагчы ў стварэньні прыватнага музэю. Прыкладная тэматыка — Беларусь у змаганьні 1918—56 г. БНР, Булак-Балаховіч, Слуцкі збройны чын, «Зялёны Дуб», «Чорны Кот», Беларуская Краёвая Абарона і іншыя нацыянальныя вайсковыя фармаваньні — гэта закрытыя тэмы савецкіх часоў і тэмы, якіх баяцца сучасныя ўлады. Буду ўдзячны за любую дапамогу, інфармацыю, падтрымку. E-mail: maja_kalekcyja@hotmail.com, т.: 8-029-722-46-04.

Войслаў Люты, hotmail.com

Сілавая і рэзкая

Беларуская манера выступаць у Кубку Дэвіса

Уладзімер Ваўчкоў і Максім Мірны дэбютавалі ў Кубку Дэвіса 16—17-гадовымі юніёрамі на кортах сьпякотнага Кот д'Івуару ў 1994 г. Спатрэбілася 10 гадоў і хуткаснае пакрыцьцё «Taraflex» менскага манэжу, якое найлепшым чынам адпавядае іх манеры гульні, каб беларуская каманда выйшла ў паўфінал Кубка.



PHOTO.BYMEDIA.NET

103 гады таму студэнт Гарвардзкага ўнівэрсытэту Ўайт Дэвіс наладзіў у Бостане першы розыгрыш каманднага турніру, удзел у якім узялі толькі дзьве зборныя — ЗША і Брытаніі. Сёньня «срэбную салатніцу» Кубка Дэвіса, неафіцыйнага каманднага першынства сьвету па тэнісе, аспрэчваюць паўтары сотні камандаў з усіх кантынэнтаў.

Дэбют беларускай каманды ў Кубку адбыўся 10 гадоў таму. Тады ў Кот-д'Івуары пры 30-градуснай сьпякоце беларусы атрымалі першую перамогу (над Альжырам) — 2:1. Праз шэсьць гадоў беларусы ўпершыню змагаліся за права патрапіць у лік наймацнейшых каманд плянэты. І два разы запар спыняліся за крок ад Сусьветнай групы, саступіўшы на чужых грунтавых пляцоўках камандам Аргентыны і Швайцарыі — абодва разы зь лікам 0:5.

Макс Мірны

Два дзесяцігодзьдзі таму бацька Максіма Мікалай Мірны прывёў сына ў тэнісную сэкцыю МАЗу да трэнэра Аркадзя Эйдельмана. На пачатку 90-х настаўнік, які зрабіў сусьветна вядомай Натальлю Зьвераву, зьехаў за акіян і забраў Мірнага з сабой. Далей справу ў свае рукі ўзяў бацька. Ён уладкаваў сына ў знакамітую тэнісную акадэмію Ніка Балецьеры, што ў Флорыдзе. Разам зь Мірным асновы майстэрства там спасьцігала і расейка Ганна Курнікава.

У 1998 г. Максім дасягнуў першага посьпеху, здабыўшы перамогу ў міксьце з амэрыканкай Сэрэнай Уільямс адразу ў двух турнірах «Вялікага шлему» — Уімблдонскім і Адкрытым чэмпіянаце ЗША. За год беларус зрабіў фантастычны прарыў наперад, пераскочыўшы з 275-й на 75-ю пазыцыю ў сусьветным табэлі аб рангах!

У 2000 г. Максім зноўку зрабіўся пераможцам «US Open», гэтым разам у больш прэстыжным мужчынскім парным разрадзе з маладым аўстралійцам Лэйтанам Х'юітам, які доўгі час будзе ўзначальваць сьпіс наймацнейшых тэнісістаў сьвету.

У асабістым разрадзе Мірны стварыў супэрсэнсацыю ўвосень 2001 г. у нямецкім Штутгарце, пасьлядоўна «паклаўшы» чатырох пераможцаў турніраў «Вялікага шлема» — харвата Горана Іванішавіча, амэрыканца Піта Сампраса, бразыльца Густава Куэртэна ды расейца Яўгена Кафельнікава. Такога 125-гадовая гісторыя сусьветнага тэнісу яшчэ ня ведала!

Цяпер Мірны па мянушцы «Зьвер» у асабістым разрадзе клясыфікацыі Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў (ATP) уваходзіць у лік 40 найлепшых. А ў парным — даўно не апускаецца ніжэй за трэцяе месца.

У свае 26 гадоў Мірны зьяўляецца адным з найбольш багатых беларусаў. Паводле зьвестак ATP, за сваю кар'еру ён зарабіў каля 4,5 млн даляраў. Тры гады таму Мірныя (Макс, а таксама ягоны бацька і мэнэджэр у адной асобе) набылі дом у Брэндэнтане (штат Флорыда, ЗША), дзе і бавяць большую частку году.

Уладзімер Ваўчкоў

Уладзімер Ваўчкоў — таксама МАЗавец. Велізарную ролю ў ягоным тэнісным лёсе адыгралі Вячаслаў Конікаў (першы трэнэр) і Сяргей Леанюк. У сям'і апошняга Ваўчкоў жыў і трэніраваўся ў Амэрыцы на працягу двух год. А пасьля той самы Леанюк, які атабарыўся ў Расеі і заняў высокую пазыцыю ў тамтэйшых тэнісных колах, усяляк дапамагаў здольнаму хлопцу. Дзякуючы Леанюку Валодзю ўключалі ў асноўную частку «Кубка Крамля» і турніру ў Санкт-Пецярбургу без аніякага адбору, хоць паводле свайго рэйтынгу ён туды і блізка не праходзіў. Нават хадзілі чуткі, што Расея паклала вока на Ваўчкова. Але чуткі так чуткамі і засталіся.

Першы значны посьпех напаткаў Уладзімера ў 1996 г., калі ён зрабіўся пераможцам юніёрскага турніру Ўімблдону. А ў 2000 г. на смарагдавых кортах лёнданскага перадмесьця для Ўладзімера настала зорная гадзіна. Распачаўшы барацьбу з кваліфікацыйнага турніру, Валодзя здабыў восем перамог запар і саступіў толькі ў паўфінале Піту Сампрасу. Пры гэтым беларус паўтарыў рэкорд турніру, устаноўлены легендарным Джонам Макінроем у 1977-м.

З тае пары, аднак, Ваўчкоў адышоў у цень. Яму ня шэнціла. Пад ціскам шматлікіх траўмаў Уладзімер у рэйтынгу ATP апусьціўся ў другую сотню. Але ў гэтым і ёсьць фэномэн Ваўчкова: паразы ў асабістых турнірах ніякім чынам не адбіліся на ягоных фантастычных выступленьнях у Кубку Дэвіса, дзе перад вачыма землякоў ён дэманстраваў непараўнальны імпэт.

Дома і пакрыцьцё дапамагае

Сэзон-2003 беларуская каманда адкрыла перамогамі над зборнымі Ізраілю, Зымбабвэ і Нямеччыны, што й вывела падначаленых Сяргея Цяцерына ў Сусьветную групу.

Прынцыповая лютаўская сустрэча між Беларусяй і Расеяй мусіла даць адказ на пытаньне: ці ня быў выхад беларусаў у эліту простай выпадковасьцю? Нашы хлопцы давялі, што не. Таму да сустрэчы з Аргентынай была прыкаваная вялізная ўвага. На гульню была акрэдытаваная рэкордная колькасьць журналістаў — 208, прычым 11 зь іх прыляцелі разам з аргентынскай зборнай.

З удзельнікаў матчу паміж аргентынцамі й беларусамі 2001 г. у Менск прыляцеў толькі Гільерма Каньяс (23-е месца ў рэйтынгу ATP). Аднак яго вяртаньне ня сталася для аргентынцаў шчасьлівым.

Стартавыя шанцы аргентынскай каманды расцэньваліся як значна вышэйшыя з тае прычыны, што ў яе складзе знаходзіліся адразу два тэнісісты, якія належалі да першай дзясяткі сусьветнага рэйтынгу, — Гільерма Корыя (4-ы) і Давід Налбандзян (8-ы). Аднак першы быў вымушаны адрачыся ўдзелу ў гульні з прычыны моцных боляў у сьпіне, а другі так і не залячыў траўмы галёнкі. У выніку магчымасьці падраўняліся. Пры гэтым Ваўчкоў і Мірны мелі вялікі плюс: хуткаснае пакрыцьцё «Taraflex» менскага манэжу найлепшым чынам адпавядае іх сілавой і рэзкай манеры гульні.

«Галоўным чыньнікам нашага звышпасьпяховага выступленьня на Кубку Дэвіса лічу хатні фактар, — адзначыў Максім Мірны карэспандэнту «НН». — Восем гадоў мы не прайграём на сваёй пляцоўцы ў Менску».

Гэтым разам Мірны і Ваўчкоў зрабілі справу датэрмінова, не прайграўшы ў першыя два дні сваім супернікам аніводнага сэту. Лідэр аргентынцаў Агусьціна Кальеры (13-е месца ў рэйтынг-сьпісе ATP) за тыдзень так і ня здолеў прыстасавацца да рэзкага адскоку мяча на хуткасным пакрыцьці. Гільерма Каньяс прыляцеў у Беларусь пазьней за ўсіх і не пасьпеў прайсьці акліматызацыю. У гэтым сьвятле выхад Каньяса на першую гульню зь Мірным выглядаў статэгічнай памылкай капітана Луза. Адзіным з аргентынцаў, хто аказаў хоць які супраціў націску беларусаў, быў 20-гадовы Хуан Манака (выйграў адзіны пераможны для аргентынцаў сэт у Ваўчкова). Але магчымасьць праявіць сябе выпала яму тады, калі вынік гульні быў ужо прадвызначаны.

5:0! Рэванш атрымаўся.

«Гэтая перамога — наш падарунак у сьвяточны велікодны дзень усім беларускім людзям!» — сказаў карэспандэнту «НН» Уладзімер Ваўчкоў.

Bielorusso — collosal!

Спартовы журналіст аргентынскага «Radio-10» Хорхе Банатольі падзяліўся сваімі ўражаньнямі ад Беларусі: «Нідзе пабываць нам ня выпала. Усё ж працаваць прыехалі, а не па выстаўках хадзіць. Наведалі толькі музэй вайны. Даволі цікава. Праўда, яшчэ цікавей было назіраць за вашымі прыгажунямі. Яны нават лепшыя, чым у Расеі. Што да самое гульні, яе вынік для нас сапраўдны шок. Bielorusso!… Collosal!»

А яшчэ нашы аргентынскія калегі ніяк не маглі зразумець, чаму ў другі дзень матчу натоўп беларускіх журналістаў сабраўся ў вэстыбюлі вакол маладой спадарыні з рашучым выразам твару. Ну як ім было растлумачыць, што з прычыны прысутнасьці на гульні прэзыдэнта краіны ягоная прэс-сакратарка Натальля Пяткевіч загадным тонам інфармавала пра тое, што можна рабіць, куды хадзіць…

Прыбыцьцё Аляксандра Лукашэнкі на гульню чакалася ў першы дзень, і ўсім акрэдытаваным журналістам было прапанавана прыйсьці ў манэж за паўтары гадзіны да пачатку гульні, бо пасьля меліся нікога не прапускаць. Але прэзыдэнт на трыбунах так і не зьявіўся. Як не зьявілася на сваіх месцах яшчэ добрая палова гледачоў. Затое наступным днём разам са зьяўленьнем першай асобы ў залі загучалі барабаны, была скаардынаваная падтрымка, застракацелі чырвона-зялёныя сьцягі…

Дарэчы, тая гіганцкая праца, якая прывяла да цудоўнага ператварэньня футбольнага поля ў тэнісны стадыён, абышлася, паводле розных ацэнак, у суму ад трох да пяці мільёнаў даляраў.

> Лукашэнка ў першы дзень не зьявіўся. Не было й добрай паловы гледачоў. Затое наступным днём разам са зьяўленьнем першай асобы ў залі загучалі барабаны, была скаардынаваная падтрымка, застракацелі чырвона-зялёныя сьцягі...

* * *

Перамога беларускай зборнай над пятай камандай сьвету ў чвэрцьфінале Кубка Дэвіса ўзьняла ў краіне новую хвалю тэніснай папулярнасьці. Толькі выхад беларускіх хакеістаў у паўфінал Алімпійскіх гульняў'2002 у Солт-Лэйк-Сыты можна параўнаць з дасягненьнем айчынных майстроў вялікай ракеткі. Усё болей дзетак выказваюць жаданьне займацца тэнісам толькі для таго, каб быць падобнымі на сваіх герояў — Мірнага ды Ваўчкова.

На прэс-канфэрэнцыі Максім Мірны адзначыў: «Цяпер нашай галоўнай перашкодай застаецца амэрыканская зборная, зь якой мы згуляем паўфінал 24—26 верасьня на іх пляцоўцы. А фінал у любым выпадку будзем прымаць на радзіме!»

Гэткія б словы ды богу ў вушы!

Кастусь Лашкевіч

21 грам душы і Шванкмаер з ачасанкам

У чарговым кінапаказе «4х4» увагу прыцягваюць фільмы «21 грам» і «Палена»

21 грам (21 grammes)
ЗША, 2003, каляровы, 125 хв.
Жанр: Драма
Адзнака: 6 (з 10)

«21 грам» — фільм, пастаўлены мэксыканскім рэжысэрам Алехандрам Іньярыту ў Злучаных Штатах. Як і ў карціне «Сука-любоў», Іньярыту агаломшвае нас складаным мантажом чалавечых лёсаў, дзе пераплеценыя ня толькі людзі, але й іхняе прошлае, і ўспаміны. А насамрэч сюжэт просты: 21 грам — столькі важыць чалавечая душа, і сьмерць у аўтакатастрофе мужа Крысьціны сутыкае Пола, які атрымаў сэрца памерлага, Крысьціну, у якую закахаўся Пол (на здымку), і Джэка, былога алькаголіка, а потым шчырага вернніка, ненаўмысна вінаватага ў катастрофе.

Наамі Ўотс, Шон Пэн і Бэнісія дэль Тора дэманструюць найвышэйшую клясу гульні: хворы становіцца мсьціўцам, узорная жонка — наркаманкаю, а рэцыдывіст — хрысьціянінам.

Пазнавальны стыль Іньярыту захоўваецца, але амэрыканскай карціне мэксыканца не стае дзёрзкага драйву, які быў у папярэдняй.

Палена (Otesanek)
Вялікая Брытанія—Чэхія—Японія, 2000

Чэх **Ян Шванкмаер** (нар. 1934) — ключавая постаць цэнтральнаэўрапейскага сюррэалізму. Сюррэалізм гэты адмысловы: з ажыўленай «візуальнай тактыльнасьцю», з грубымі анімаванымі прадметамі, кшталту закаханых кавалкаў мяса, якія мілуюцца й уцякаюць ад злосных нажоў і патэльні.

Шванкмаер шмат экспэрымэнтаваў, у тым ліку па-свойму ставіў і клясыку: «Фаўста», «Штосьці з Алісы» паводле Керала. А апошняя стужка сюррэаліста — чэская казка «Палена». Пра тое, як у бясплодных бацькоў паленца ператварылася ў дзіця.

Можаце ўявіць, што зрабіў з гэтай гісторыяй майстар Шванкмаер. У анатацыі фільм пазначаюць як «страшную казку». Карціна рарытэтная, ні на дысках, ні на відэа яе не знайсьці.

Андрэй Расінскі

Каза з ільвамі

17 красавіка ў канцэртнай залі «Менск» пройдзе прэзэнтацыя відэаролікаў — пераможцаў міжнароднага фэстывалю рэклямы «Канскія львы». Штогод у Канскім фэстывалі ўдзельнічаюць 16 тыс. ролікаў, зь якіх у фінал трапляюць соцень пяць. У той самы дзень у Менску пройдзе прэзэнтацыя пераможцаў Маскоўскага міжнароднага фэстывалю рэклямы, а таксама фэстывалю рэклямы краінаў Усходняй Эўропы «Golden Drum» (Славенія). Весьці рэй там будзе эмігрант ва Ўкраіну ды-джэй Сяргей Кузін. Перад публікай выступіць група «Барабанны экстаз». Цана білетаў 14—19,5 тыс. руб.

Лянг з прыватнай калекцыі

Ён аддаў перавагу эміграцыі, калі Гёбэльс прапанаваў яму ўзначаліць нямецкі кінэматограф.

У Музэі гісторыі кіно пачаўся паказ фільмаў рэжысэра-клясыка Фрыца Лянга. Аўтар «Мэтропалісу», «Стомленай сьмерці», «М», зьнятых у Вэймарскай Нямеччыне, эміграваў у ЗША ў 1933-м. Ён даў Гёбэльсу згоду і тым жа вечарам цішком пакінуў краіну.

«Мы хочам паказаць Лянга непапсовага, малавядомага, таму абралі ягоныя стужкі амэрыканскага пэрыяду», — кажа арганізатар кінавечароў студэнт Мюр Фарыдовіч, з хатняй калекцыі якога стужкі і дэманструюцца. У Беларусі кінаклясыку набыць цяжкавата, і ён шукаў стужкі ў Расеі. Беларускага перакладу не рабіў. Фільмы будуць ісьці ў перакладзе на расейскую.

16 красавіка на вул.Сьвярдлова, 4 можна пабачыць фільм «Жанчына ў акне» — гісторыю залётаў немаладога прафэсара да самотнай прыгажуні. 20-га — «Плашч і кінжал», пра змаганьне вучонага супраць стварэньня ядравай зброі. 23 красавіка — «Начная разборка», паводле правальнай брадвэйскай п'есы, але зусім не банальны. 27-га — «Блакітная гардэнія», пра цікавую повязь дзьвюх жанчын. 30 красавіка — «Вялікі гнеў», трылер у найлепшых традыцыях. 4 траўня паказ закрые прыгодніцкая стужка «Мунфліт». Усе фільмы дэманструюцца ў Беларусі ўпершыню.

Кубліцкі й Заблоцкі на прэзэнтацыі

Творчая вечарына пісьменьніка Пятра Васючэнкі адбудзецца 16 красавіка (пятніца) а 18.00 у актавай залі Дому літаратараў. У праграме — прэзэнтацыя кнігі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» і спэктакль тэатру «Зьніч» «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага». Цана квіткоў 1500 руб. Даведкі праз т.: 231-75-53, 220-56-32 (тэатар), 236-03-48 (Саюз пісьменьнікаў).

Сяргей Будкін, АШ

Клюбнае жыцьцё

«Арабснэк», вул. Сурганава, 41/1, тэл. 679-00-00.

22 красавіка (чц), 22.00 — адзінае выступленьне «The Biz» (Benny Benassi live show) у Менску. Таксама ў праграме dj Шушукін (Масква), шоў бармэнаў.

«Bronx», вул.Варвашэні, 17/1, тэл. 288-10-61, GSM Velcom: 103 і 105.

15 красавіка (чц), 22.00 — dj Kuikov.

16 красавіка (пт), 22.00 — «Madera Hard Blues». Жывы гук.

17 красавіка (сб), 22.00 — dj Dasha Pushkina, dj Paliony.

21 красавіка (ср), 22.00 — Тані Фарэда (вакал). Жывы гук.

«Гудвін», пр.Скарыны, 19, тэл. 226-13-06, 626-13-03.

15 красавіка (чц), 23.00—5.00 — Валік Грышко, «Лёгіка мэтро», N.D. Bell, dj G.O.S.H.A ў праграме, прысьвечанай гурту «Depeche Mode».

«NC», вул.Кастрычніцкая, 17, тэл.760-59-55, 638-57-96, 708-84-11.

17 красавіка (сб) 23.30—6.00 — DRUMandBASS.abstract. Іграюць: Buger (Віцебск), T-Trider, Walder, Sidewalk, Temax, Subway, Sworm, E.gor. Цана білетаў 7000 папярэдне, 9000 у касе.

«Presto», пр.Скарыны, 56, тэл. 232-54-49, 232-15-79.

17 красавіка (сб), 22.00 — dj Dasha Pushkina, dj Ядzik, трыё «Candyman». Квіткі па 15 тыс., з флаерам — 10 тыс.

«Рэактар», вул.Харужай, 29, тэл. 228-61-60, 268-61-07.

18 красавіка (ндз), 19.00. — «Dolphin», прэзэнтацыя новага альбому «Зорка». Квіткі ад 25 да 35 тысяч. Даведкі праз тэл. 266-76-01, 655-55-96.

«Ямайка», вул.Альшэўскага, 10, тэл. 252-07-26.

16 красавіка (пт), 21.00—24.00 — dj Dasha Pushkina. З 3.00 — dj Party Phone, dj Antonov.

Інфармацыя паводле mixtura.org

Тэатры і канцэрты

Тэатар імя Янкі Купалы

16 красавіка (пт) — «Страчаны рай».

17, 21 красавіка (сб, ср) «С.В.».

18, 22 красавіка (ндз, чц) «КІМ».

19 красавіка (пн) «Каханьне ў стылі барока».

Малая сцэна тэатру

21 красавіка (ср)
Апошні паказ спэктаклю «Восеньская саната» І.Бэргмана ў пастаноўцы У.Савіцкага.

18 красавіка (ндз)
Апошні паказ спэктаклю «Брат мой, Сіман...» А.Казанцава ў пастаноўцы А.Гарцуева. У спэктаклі занятыя: Ігар Дзянісаў, Вячаслаў Паўлюць, Ганна Хітрык.

Балет

21 красавіка (ср) — «Шчаўкунок».

23 красавіка (пт) — «Жызэль».

Опэра

15 красавіка (чц) — «Хаваншчына».

17 красавіка (сб) — «Сэвільскі цырульнік».

22 красавіка (чц) — «Тоска».

Музычны тэатар

15 красавіка (чц) — «Каралева-чардашу».

16 красавіка (пт) — «Цыганскі барон».

17 красавіка (сб) — вечар балету: «Новыя амазонкі» і «Шахераза-да».

18 красавіка (ндз) — «Марыца».

21 красавіка (ср) — «Кажан».

22 красавіка (чц) —«Прынцэса цырку».

23 красавіка (пт) — «Дарагая Памэла».

Тэатар імя Горкага

17 красавіка (сб) — «Паведамленьне Марыі».

21 красавіка (ср) — «Ад'ютантка Яго Вялікасьці».

22 красавіка (чц) — «Люці».

Тэатар эстрады (Маскоўская, 18а)

17, 18 красавіка (ср, чц) — фэстываль вулічнай культуры «Люстра вуліц». Пачатак а 18-й. Даведкі праз тэлефон 657-02-52.

Клюб імя Дзяржынскага (Камсамольская, 30)

17 красавіка (сб) — «Пізанская вежа».

Клюб «Акварыюм» (Кульман, 14)

17 красавіка (сб) — Хард-рок-фэстываль «Красавік».

Цэнтральны Дом афіцэраў

Тэатар «Ля Нікіцкай брамы» **15 красавіка** (чц) паказвае «Песьні нашай камуналкі» ў пастаноўцы Марка Разоўскага.

Палац спорту

22 красавіка (чц) — «Smash!!!»-бэнд і шоў-балет «Smash».

Заля камэрнай музыкі Белдзяржфілярміоніі (пр.Скарыны, 44а)

16 красавіка (пт) — «Песьні мінулых дзён».

17 красавіка (сб) — ансамбль флейтыстаў «Сірынкс».

19 красавіка (пн) — Менскі струнны квартэт.

22 красавіка (чц) — у рамках форуму «Чэская музыка» выступае ансамбль «Клясык-Авангард».

23 красавіка (пт) — ансамбль «Венскія салісты» з Аўстрыі.

Белдзяржфілярмонія

17 красавіка (сб) — «Беларуска-францускія музычныя сустрэчы». Пачатак а 21.30

Канцэртная заля «Менск»

16 красавіка (пт) — канцэрт Аляксандра Дольскага.

22 красавіка (чц) — ансамбль «Чысты голас».

Лекцыя Мальдзіса

У пятніцу **16 красавіка** ў аўд.314 Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту (вул.Броўкі, 3А) а 18-й адбудзецца выступ прафэсара **Адама Мальдзіса** на тэму «Рэстытуцыя культурных каштоўнасьцяў».

Выставы й кірмашы

Гістарычны музэй

Выстава работ удзельнікаў «Дзень зямлі. Беларусь-2004» працуе да **26 красавіка**, а выстава «Вобраз Маці Божай у іканапісе» — да 4 траўня.

Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47)

Да **13 траўня** працуе выстава жывапісу мастакоў Аляксандра Забаўчыка й Сяргея Малішэўскага «Эгіпэт».

Мастацкі музэй

«Расейскі жывапіс» са сховішчаў Музэю.

Выстава Аляксандра Шылава.

Абедзьве выставы можна пабачыць да пачатку траўня.

Белэкспа

З **15 да 18 красавіка** VII Вясновы кірмаш турыстычных паслуг «Адпачынак-2004».

Палац дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41)

З 14 да 17 красавіка выстава-продаж «Дача. Сад. Агарод».

Кінаафіша

«Аўрора» (253-33-60)
«Нешчасьліўцы»: **16** (пт) 15.00, 17.00, 19.00; **17, 18** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.00, 17.00, 19.00.
«Монстар»**** («Оскар-2004»): **16—18** (пт-ндз) 21.10.
«Дачка майго боса»: **16** (пт) 16.40; **17, 18** (сб, ндз) 14.40, 16.40.
Кінафармат 4х4:
«21 грам»: **16** (пт) 18.40, 20.50.
«Хепі-энд»: **17** (сб) 18.40, 20.50.
«Палена»: **18** (ндз) 18.40, 20.50.
«Бярэсьце» (272-87-91)
«Каханьне паводле правілаў... і без» («Оскар-2004»): **12—18** (пт-ндз) 16.30, 21.10.
«Дом зь пяску і туману» («Оскар-2004»): **16** (пт) 18.45; **17, 18** (сб, ндз) 14.00 (іл), 18.45.
«Кастрычнік» (232-93-25)
«Халодная гара» («Оскар-2004», прэм'ера): **16** (пт) 15.00, 18.00, 21.00; **17, 18** (сб, ндз) 15.00 (іл), 18.00, 21.00.
«Масква» (223-27-10)
«Халодная гара» («Оскар-2004», прэм'ера): **16** (пт) 18.20, 21.00; **27** (сб) 15.30, 18.20, 21.00; **18** (ндз) 15.30 (іл), 18.20, 21.00.
«Мір» (284-37-71)
«Каханьне паводле правілаў... і без» («Оскар-2004): **16** (пт) 16.40 (іл); **17, 18** (сб, ндз) 14.30, 16.40.
Кінафармат 4х4:
«Палена»: **16** (пт) 19.00, 21.10.
«Сыльвія»: **17** (сб) 19.00, 21.10.
«21 грам»: **18** (ндз) 19.00, 21.10.
«Перамога» (223-77-66)
«Буйная рыба» («Оскар-2004»): **16—18** (пт-ндз) 14.10.
Кінафармат 4х4:
«Хепі-энд»: **16** (пт) 16.30, 18.50, 21.10.
«21 грам»: **17** (сб) 16.30 (іл), 18.50, 21.10.
«Сыльвія»: **18** (ндз) 16.30 (іл), 18.50, 21.10.
«Піянер» (227-64-87)
«Бабуся»: **16—18** (пт-ндз) 17.50.
«Анёлы Чарлі-2: толькі наперад»: **16—18** (пт-ндз): 16.00, 19.40.
«Летуценьнікі»****: **16—18** (пт-ндз) 21.30.
«Цэнтральны» (227-34-16)
«Блубэры»: **16** (пт) 11.00, 15.50; **17, 18** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.50.
«Заплямленая рэпутацыя»***: **16—18** (пт-ндз) 13.30, 18.20.
Кінафармат 4х4:
«Сыльвія»: **16** (пт) 18.20, 20.50.
«Палена»: **17** (сб) 18.20, 20.50.
«Хэпі-энд»: **18** (ндз) 18.20, 20.00, 21.40.

(іл) — ільготны сэанс (50%)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Юнаму гледачу

«Аўрора»
«Карлік Нос»: **16** (пт) 12.30, 14.30; **17, 18** (сб, ндз) 12.30.
«Бярэсьце»
«Абрафакс пад пірацкім сьцягам»: **17, 18** (сб, ндз) 12.00.
«Масква»
«У пошуках Нэма»: **17, 18** (сб, ндз) 13.30.
«Мір»
«Кевін у краіне Драконаў»: **17, 18** (сб, ндз) 12.30.
«Піянер»
«Баляда пра салдата»: **16, 17** (пт, сб) 14.00.
«Дзеці дажджу»: **18** (ндз) 10.30, 14.00.
«Гуляй як Бэкхем»: **16—18** (пт-ндз) 12.00.

Опэра

18 красавіка (ндз) — «Горад майстроў».

Музычны тэатар

17 красавіка (сб) — «Бураціна.by».

18 красавіка (ндз) — «Стойкі алавяны салдацік».

Тэатар імя Горкага

22 красавіка (чц) — «Джэльсаміна ў Краіне хлусаў».

Тэатар юнага гледача

17 красавіка (сб) — «Сястра мая русалачка».

18 красавіка (ндз) — «Парася, якое сьпявае».

Скульптар Алесь Шатэрнік стварае праект надмагільля Васіля Быкава. Якім яно мае быць, ён пабачыў у сьне. Сям'я Быкава ўхваліла праект помніка, прапанаваны скульптарам.

Алесь Шатэрнік

Сьвяты Васіль Богам Дадзены

17 сакавіка бачыў дзіўны сон. Васіль Быкаў на Радзіме. Многія яго бачаць, хочуць пагаварыць зь ім, нават зрабіць фатаздымкі разам зь яго постацьцю, але гэтага нікому не ўдаецца, ён застаецца адзін і раптам зьнікае. Яго не відаць, але ён пакідае аб сабе дзіўны знак — прыбіты трыма цьвікамі невялікі кавалачак паўвайсковай тканіны, пад якім закрыта загадкавае слова...

Некаму ўдаецца прыўзьняць гэты шматок, а пад ім надрукавана: СВАБОДА, з D лацінкаю.

Калі кепскія сны — як казала мама, «хай ляцяць на сухія лясы»... Але сёньня ўбачыў ці пачуў сымболіку сну праз мастацкі вобраз нашага «Васіля»...

Калісьці на былых мурах старой сынагогі ў Ракаўскім прадмесьці, дзе месьціліся нашыя мастацкія майстэрні, нехта з мастакоў намаляваў «Тып Беларуса» — мужчынскі профіль з характэрнымі рысамі тваравага вугла лба і носа...

Вакол гэтага імправізаванага партрэту ўзьнікалі гаворкі, а часам і спрэчкі, як калісьці казаў Уладзімер Караткевіч, «дзе два беларусы, дык дзесяць думак»: некаторыя згаджаліся з тыпажом, а іншыя не... Але гэта, пры ўсім тым, быў сапраўдны тыпаж беларуса, непрыкметны, асабліва нічым ня вылучаны. Такі тыпаж вельмі ўдаўся мастаку Таболічу: «беларус прабіраецца сярод чароту, зь сеткамі на плячох»...

У нашых майстэрнях працаваў, сьветлай памяці, вельмі сьціплы чалавек мастак-графік Толя Ткачонак, тонкі лірык-акварэліст, які, можа, і намаляваў гэты насьценны «графіці-партрэт». Толя нікому ніколі анічога ня мог запярэчыць. Праўда, яшчэ задоўга да Лукашэнкі, толькі калі добра «паддасьць», выходзіў адзін на калідор, біў сябе ў сухія грудзі і гучна заяўляў: «Я самы чэсны чалавек у сьвеце!» Відаць, і сапраўды гэта было так...

Анатоль да вайны вучыўся ў Віцебскім мастацкім пэдагагічным вучылішчы, разам з Васілём Быкавым, нават з твару вельмі падобны да Васіля, такі ж блакітнавокі, сівавалосы...

Мне пашчасьціла сустрэцца з Васілём Уладзімеравічам, калі працаваў над помнікам Андрэю Макаёнку. Дагэтуль у мяне знаходзяцца здымкі, дзе Быкаў з рознымі дзеячамі, якіх час і лёс раскідаў па розных бакі... Гэта і Шамякін, і Матукоўскі, і Барадулін...

Васіль Быкаў мой помнік Макаёнку ўспрыняў добра, у адрозьненьне ад Івана Пятровіча, але і апошні даў згоду на ўсталяваньне, нават разам зьезьдзілі на завод паглядзець бронзавы адлівак, апасьля чаго ўжо Шамякін мне не пярэчыў... Увогуле, гэта асобная цікавая тэма...

Дык вось, вяртаючыся да сэнсу сну: разваага аб трох цьвіках і слове «СВАБОДА»...

Мне бачыцца: «Вялікі Сымбалічны Партрэт» на каменнай паліраванай падстаўцы, на якой бронзава-блакітныя валошкі... і словы-словы, як бы аўтограф — «С. Ва. Бо. Да.» — «Сьвяты Васіль Богам Дадзены».

Свабода і Сьвяты пачынаюцца з аднолькавай літары…

20 сакавіка 2004 г.

БІБЛІЯТЭКА ЛЯВОНА БАРШЧЭЎСКАГА

Адказ Бэрка Праляскоўскаму

Выкладнік гісторыі культуры ў Кембрыджы, сябар навуковае рады каледжу Эмануэля Пітэр Бэрк па колькасьці выдадзеных на беларускай мове кніг выйшаў на пачэснае месца — недзе пасьля Шэксьпіра й Міцкевіча. Калі весьці гаворку пра «немастацкія» кніжкі, дык тут Бэрк выглядае абсалютным чэмпіёнам: пасьля выхаду ў ліцэйскім выдавецтве БГАКЦ у 1997 г. яго манаграфіі «Рэнэсанс» і публікацыі ў «Тэхналёгіі» «Народнай культуры Эўропы раньняга Новага часу» ў 1999 г. — цяпер, у той самай «Тэхналёгіі», выйшла яшчэ адна праца гэтага аўтара. У манаграфіі «Гісторыя і сацыяльная тэорыя» П.Бэрк спрабуе даць адказ на пытаньне, якая карысьць з гісторыі для гісторыкаў.

У першым разьдзеле кнігі аўтар разглядае няпростую гісторыю ўзаемадачыненьняў гісторыкаў і сацыяльных тэарэтыкаў, робячы акцэнт на працах тых гісторыкаў і філёзафаў, што скептычна ставіліся да сацыяльнай тэорыі (фон Ранке, Буркгарт, Дыльтай, Крочэ), і тых, хто ўсяляк імкнуўся «сацыялягізаваць» гістарычную навуку (Грын, Таквіль, Маркс, Вэбэр). Сымптомы «заміраньня» сацыяльнай і гістарычнай навук Пітэр Бэрк бачыць перадусім у працах Гейзынгі, а апошнім часам — у дасьледаваньнях Кліфарда Гірца, Эрыка Вулфа, Маршала Салінса.

У разьдзеле «Сацыяльная тэорыя і сацыяльныя зьмены» разглядаюцца дзьве клясычныя тэорыі сацыяльных зьменаў — спэнсэраўская і марксісцкая. Прычым, паводле Бэрка, для абедзьвюх характэрная «абмежаванасьць пэрспэктывы». Наступны разьдзел прысьвечаны пазьнейшым (канец XX ст.) канцэпцыям сацыяльнай тэорыі, сфармуляваным у працах Норбэрта Эльяса, Фэрнана Брадэля, Мішэля Фуко, Майкла Мэна, Чарлза Тылі. Выснова Бэрка: сацыяльныя тэорыі мусяць быць разнастайнымі, а спроба зь іх дапамогай выбудоўваць глябальныя схемы разьвіцьця грамадзтва ёсьць заняткам беспэрспэктыўным, а часам і небясьпечным.

Кнігу зрабіў даступнай беларускамоўнаму чытачу Мікола Гілевіч (раней ён жа пераклаў кніжку Бэртрама «Разбалянсаваная Эўропа»). А сама праца Бэрка дае годны адказ на спробы ашчасьлівіць беларусаў «дзяржаўнай ідэалёгіяй».

Лявон Баршчэўскі

Пітэр Бэрк. Гісторыя і сацыяльная тэорыя / Пераклад з анг. Міколы Гілевіча. — Менск: Тэхналёгія, 2003.

Засталіся толькі лічбы: 1915—2002

АРХІЎ УЛАДЗІМЕРА СОДАЛЯ

З польскай Познані, з той Познані, назоў якой пазначылі на другім паэтычным зборніку Францішка Багушэвіча «Смык Беларускі», прыйшла вельмі сумная для нас і моцна запозьненая для Беларусі вестка: 24 красавіка яшчэ пазамінулага году памёр у Хошчне апошні стрыечны Песьняроў унук Янка Тарчэўскі.

Гэта быў сьціплы і ўвадначас мудры ад прыроды чалавек з трошкі зажуранымі, як у яго слыннага дзядулі, вачыма. Зь іх праменілася заўсёдная беларуская шчырасьць, беларуская шляхетная цеплыня.

Нарадзіўся ён праз 15 гадоў пасьля сьмерці Францішка Багушэвіча, але шмат чаго чуў пра яго ад сваёй бабулі — роднай паэтавай сястры Ганны. Хлопчыкам ён ня раз гасьцяваў у Песьняровай жонкі Габці і ягонай дачкі Туні. Ведаў ён і Багушэвічавага сына Тамаша. Ня раз забаўляўся з родным Песьняровым унукам Тобам-Франакам. Янкаў татусь, таксама Ян, Янак, які ўзяў сабе за жонку паэтаву пляменьніцу, быў вялікім сымпатыкам Багушэвічавага таленту — дзе толькі мог, пашыраў ягоную творчую спадчыну. Гэтае замілаваньне Багушэвічавай постацьцю перадалося і Янку меншаму, з малых гадоў. Ён са шляхетнай элегансцыяй гаварыў на нашай мове. Ведаў і шанаваў усю дзядулеву спадчыну...

Шукаючы якіхсьці Багушэвічавых сьлядоў, ягоных крэўных, пра Тарчэўскага я пачуў у Ашмяне. Неўзабаве на шчасьлівым часе мы зь ім спаткаліся ў Вільні, куды ён прыехаў з Польшчы на гасьціну да сваякоў, а затым і ў Менску. Гэта былі незабыўныя, сардэчна даверлівыя стрэчы. Кожнае слова Тарчэўскага, кожная ягоная згадка пра Багушэвіча былі для мяне і для ўсёй нашай беларускай грамады нібы зазіркам за шырму невядомасьці, нябыту...

Тады ж, пры першай стрэчы, дзядзька Янка прывёз і перадаў мне некалькі фотаарыгіналаў Багушэвічаў. Сярод іх здымак з 1863 г.

З тае пары мы зь дзядзькам Янкам пачалі стала ліставацца. Я закідаў яго сваімі пытаньнямі, а ён адпісваў на іх, як мог, вычэрпваючы з сваёй памяці ўсё, што толькі ведаў пра Багушэвічаў. Між іншым, усе яго лісты вартыя абнародаваньня: у іх жыве Багушэвічаў дух. Пасьля мы зь ім сустракаліся яшчэ не адзін раз. Прыяжджаў ён у Вільню, у Ашмяны да сваіх крэўных — Тарчэўскіх ды Родзевічаў. Не прапускаў нагоды наведаць і мяне ў Менску. Я змог нават запрасіць яго на нашую тэлевізію. У тэлевізійных фондах павінен быць гэты запіс, калі там даражаць сваёй гісторыяй. Што ж да мяне, я маю копію таго запісу.

Падчас адной з апошніх сустрэч дзядзька Янка перадаў мне таксама найкаштоўнейшыя сямейныя рэліквіі — мэдальён з імёнамі і мацамі ўсіх сьвятых, шкаплерык бабчын. «Перадаю гэта ўсё, браток, табе. У мяне ў Польшчы нікога няма. Як памру, то тут усё гэта змарнуецца. А ты ведаеш, як усяму гэтаму даць рады!..» Сярод гэтых рэліквіярыкаў быў адзін самаробны, зроблены ягонай бабкай Ганнай, Францішкавай сястрой, у ашмянскім астрозе. Цяпер усе гэтыя рэліквіярыкі перахоўваюцца ў Чырвоным Касьцёле. Тады ж Тарчэўскі прывёз перапісаную ім лацінкаю цэлую беларускую ананімную паэму «Баўтручок», якую вельмі любіў дэклямаваць на розных вечарынах ягоны тата-нашанівец (гл. публікацыю «Шляхціц з-пад Ашмяны» ў «НН» №44'2003). Згадваю гэта ўсё і прыпамінаю, як было хораша зь дзядзькам Янкам: спакойны, ураўнаважаны, разважлівы, нетаропкі. Слова ягонае ніколі не абганяла думкі.

Яго імя павінна быць упісана ў нашу гісторыю. Ён хоць і жыў у Польшчы, але ягонае сэрца заўсёды ныла па радзіме. Па сваім падашмянскім засьценку Асінаўка. То чаму ж тады ацураўся свайго роднага кута? «Чаму ж не жылося на бацькоўскіх гонях?!» — неяк раз я пацікавіўся ў дзядзькі Янкі. «А братачка ты мой, — адказаў ён каротка. — Хто б гэта са свайго котлішча ні з таго ні зь сяго паехаў у невядомы сьвет... Не давалі жыць. Я ўжо быў у сьпісе на Сібір. То лепей Польшча, як Сібір...»

З 24 верасьня 1944 г. да траўня 1945 г. быў у войску, ваяваў з гітлераўцамі. Меў пра гэта і адпаведны дакумэнт-пасьведчаньне.

Ён пільна сачыў за ўсім, што рабілася ў Беларусі. Асабліва радаваўся, калі Беларусь набыла незалежнасьць: «От, браток, да якой я шчасьлівай хвілі дажыў, — казаў ён. — І бел-чырвона-белы сьцяг я ведаю з маленства. Мой тата прагнуў гэтай незалежнасьці». Прыгадалася, калі яшчэ ў савецкія часы дзядзька Янка прыехаў да мяне ў Менск, я яго фатаграфаваў на фоне чырвона-зялёнага сьцяга з арнамэнтам — гэтак мне хацелася моцна «прышпіліць» дзядзьку Янку да Беларусі. Пра бел-чырвона-белы сьцяг я тады мала што ведаў ці мо і нічога ня ведаў. Пазьней дзядзька Янка прызнаваўся: «Я так хацеў запярэчыць гэтае фотаграфаваньне, але баяўся пакрыўдзіць: ты гэтак стараўся, рупіўся, завіхаўся...»

От такі быў Францішкаў нашчадак — беларус з-пад Ашмяны Янка Тарчэўскі. Ягонае імя, ягоная рупнасьць пра свайго слыннага продка заўсёды будуць неадлучныя ад імя аўтара «Дудкі Беларускай». Пры канцы колькі слоў зь ліста Анатоля Маўчуна, які ўсім паведаміў пра сьмерць апошняга песьняровага ўнука.

«Познань, 24-га траўня 2003 г.

Здароў, Валодзя!

...Толькі што вярнуўся з Хошчна. Тое, што даведаўся, зьмяшчаю ў адным сказе: «Янка Тарчэўскі нарадзіўся 27 красавіка 1915 г. — памёр 22.04.2002 г.» Вось і ўсё. Ён рэдка адпісваў на мае лісты. Тарчэўскі меў жонку, але яна апраўдваецца, што беларускай мовы — лістоў — не разумее. Па-мойму, маючы мой адрас, магла б паведаміць пра тое, што цяжка хварэў, што памёр. Відавочна, не ў галаве ёй было гэта. Словам, даведаўся, што нічога ўжо па ім не засталося. Крыху крыўдна. Але больш сумна: ані сваякоў, ані знаёмых Тарчэўскі мне ніколі не называў, а нават і не гаварыў пра іх. Некалі ён меў сястру. Жонка гаворыць, што ніколі ня чула пра яе...

Пераглядаючы захаваныя ў Янкавай жонкі «адміністрацыйныя» паперы (быццам іншых дакумэнтаў не захавалася), я бачыў пасьведчаньне, што Янка Тарчэўскі ўдзельнічаў у другой сусьветнай вайне. Іншых дакумэнтаў не знайшоў. Ведаю, што пасьля вайны ён меў гаспадарку, якую пакінуў — чаму? — і пачаў жыць у Хошчне. Можа, табе ён што расказваў? Здаецца, ведаеш ягоных сваякоў на Віленшчыне. Мушу пачаць шукаць сярод карэспандэнцыі ранейшага часу чаго-небудзь.

Анатоль Маўчун».

З Анатолевага ліста відаць, што ён таксама хоча ў красавіку зрабіць у беластоцкай «Ніве» публікатку пра Янку Тарчэўскага. Што ж, намер пахвальны, дзядзька Янка заслугоўвае гэтага.

Уладзімер Содаль

• НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

Вяршынін М. Выбраныя творы (сатыра й гумар). — Менск: УП «Тэхнапрынт», 2003. — 526 с.: іл. 600 ас.

Кніга зьмяшчае байкі, фэльетоны, гумарэскі, калямбуры, эпіграмы, сатырычныя паэмы.

Жакмэн Ф. Поры году / Перакл. з франц. Н.Мацяш. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 116 с. 500 ас.

Зборнік вершаў, прызнаны эўрапейскімі літаратуразнаўцамі найлепшым у бэльгійскай паэзіі другой паловы XX ст., загучаў па-беларуску.

Жураўлёў В. Якуб Колас і паэтыка беларускага раману / Нав. рэд. У.Гніламёдаў. — 2-е выд., выпр. і дап. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 208 с. 2000 ас.

Першае выданьне кнігі пабачыла сьвет у 1982 г.

Куртаніч В. Залюстрэчча для Алісы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 312 с. 300 ас.

У кнігу ўвайшлі аднайменны раман, п'еса «Ружы для чужога каханка», аповесьці «Па вузкай дарозе ў цесную браму», «Распусьніца, альбо Чырвоны Каптурок з Швальмштату», «Эдэм пачынаецца летам» і апавяданьне «Ў прымрак самоты, у звабны адчай».

Ладысеў У. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленьне дзяржаўнасьці й тэрытарыяльнай цэласнасьці Беларусі (1917—1939). — Менск: БДУ, 2003. — 307 с. 500 ас.

У пяці разьдзелах дасьледаваньня — «Беларускі нацыянальны рух у пэрыяд лютага—кастрычніка 1917 г.», «Працэс фармаваньня дзяржаўнасьці Беларусі пасьля кастрычніцкіх падзеяў 1917 г.», «Беларуская дзяржаўнасьць на савецкай аснове», «Аднаўленьне тэрытарыяльнай цэласнасьці Беларусі» й «На заключным этапе кансалідацыі беларускай нацыі» — разгледжаны пакручасты працэс дзяржаўнага будаўніцтва й уплыў на яго міжнародных падзеяў ды ўнутраных палітычных умоваў. Кніга зьмяшчае таксама біяграфічныя зьвесткі пра 41 нацыянальна-палітычнага дзеяча Беларусі й разгорнуты дакумэнтальны дадатак — Устаўныя Граматы БНР, пастановы, пратаколы савецкіх уладаў ды іншыя матэрыялы, датычныя аднаўленьня беларускай дзяржавы ў XX ст.

Філяматы: Бюлетэнь Рэсп. грамадзкага аб'яднаньня «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)». — 2003. — №4 (7). — 88 с. 299 ас.

Філяматы: Бюлетэнь Рэсп. грамадзкага аб'яднаньня «Таварыства аматараў ведаў (філяматаў)». — 2004. — №1 (8). — 84 с. 299 ас.

«Новы нацыяналізм» А.Лукашэнкі, беларуска-расейскія стасункі, зьмены ў палітыцы апазыцыі, пэрспэктывы ўваходжаньня Беларусі ў Эўразьвяз і эканамічныя перашкоды на шляху нашае краіны ў Эўропу — такія тэмы бюлетэню. Аўтарскі склад: У.Конан, П.Садоўскі, А.Хадыка, Л.Гразнова ды інш. Замовіць выданьне можна празь e-mail: p_university@open.by або праз т.: 280-07-97.

Шахматы-плюс: Незалежнае інфармацыйна-асьветніцкае выданьне. — 2004. — № 1(2). — 56 с. 299 ас.

Другі нумар беларускамоўнага спэцыялізаванага часопісу распавядае пра дасягненьні беларускіх шахматыстак, а таксама прапануе матэрыялы па гісторыі шахматаў у Беларусі, шахматныя задачы ды эцюды.

Шніп В. Беларускае мора: Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 142 с. 1200 ас.

У новую кнігу паэта ўвайшлі гістарычныя баляды, санэты пра каханьне й вэрлібры.

Янка Купала пра беларускую мову: Выракацца роднай мовы ня маем права. — 12 с.

У брашурцы сабраныя ўрыўкі зь вершаў і публіцыстычных артыкулаў Янкі Купалы, дзе паэт разважае пра ролю мовы ў жыцьці народу.

Ставицька Л. Короткий словник жаргонної лексики української мови: Містить понад 3200 слів і стійких словосполучень. — Київ: Критика, 2003. — 336 с.

Вельмі хочацца верыць, што беларусы таксама прычакаюць навуковага выданьня падобнага кшталту. На жаль, адзіны прыклад, што прыходзіць на памяць у сувязі зь беларускай «жаргоннай» лексыкаграфіяй, — слоўнічак, зьмешчаны Славамірам Адамовічам у «Турэмным дзёньніку». Аўтарка ўкраінскага слоўніка — доктарка філялягічных навук, загадчыца аддзелу сацыялінгвістыкі Інстытуту ўкраінскай мовы НАН Украіны — сабрала «сакавітыя» ўзоры з сучаснай мастацкай літаратуры ды пэрыёдыкі: «пікап», «тусьня», «зюзюк» ці той жа «адмарозак». Гэтаксама як нельга забывацца, што «іншамоўнасьць» у гутарковай мове — магутны сродак падкрэсьліць іранічнасьць выказваньня.

Тацяна Вабішчэвіч

Уладзімер Лобач

Маім дзядам Мацею і Івану ахвярую



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ула

«Сны праўдзяць», — упэўнена гавораць старыя людзі менавіта пра такія сны, бо на схіле веку адгадкі ўжо засьпелі іх: кожнага свае і кожнага — зьнянацку.

Сны, як і дні, бываюць розныя: сьветлыя, змрочныя, нішчымныя, радасныя ці бязвольныя. Усе яны — незьлічоныя сьпіцы дзівоснага кола, званага Доляй. Куды мчыць (бяжыць, ледзьве коціцца) тое кола, дзе спыніцца і які сон будзе апошні — багам вядома. Як і дні, усе сны памяцьцю не занатоўваюцца і не захоўваюцца. Некаторыя, што прыходзяць начным жахам-сполахам, уяўным дотыкам непапраўнай бядоты-роспачы, прагнеш сьцерці і забыцца назаўжды, як і на тыя дні, што былі адзначаныя ліпкім жывёльным страхам ці пякельным сорамам за нешта вычварна выраблене. Бываюць сны-залацінкі, калі душа на сваім начным шпацыры спатыкае нешта шчымліва-радаснае, а назаўтра раніцай жонка гаворыць, што ты ў сьне сьмяяўся, «як малое дзіця», — шчыра й няўрымсьліва, так, як у жыцьці ўжо даўно не сьмяешся. Гэтыя сны такія ж рэдкія, як і праўдзівыя залацінкі ў беларускіх геалягічных пародах. Таму ашчадна зьбіраеш іх, беражліва носіш з сабою...

Сны-будзённасьць памяць засыпае жвірам забыцьця ўжо праз гадзіну па абуджэньні. Аўтаматызаваная самаахова мае сваю лёгіку: будзённасьці зь лішкам хапае й на яве. Але ёсьць асаблівыя сны... Прачнуўшыся, доўга ляжыш у невытлумачальным здранцьвеньні, раптоўным трывожным одуме, што аніяк не характэрны для гэткае раньняе часіны, а то і ночы. Сон ва ўсіх сваіх драбніцах перасьледуе цябе і ўдзень, застрэміўшы сьвядомасьць нечаканай загадкай. Спрабуеш яе адгадаць, зацята напружваючы ўвесь свой інтэлектуальны досьвед і хілыя парасткі інтуіцыі, бо ўсім нутром адчуваеш, *наколькі* значнай для цябе асабіста будзе адгадка. Гэта сны-знакі, сны, якія *даюцца* ў знакі, ведама ж, не суседзямі ці калегамі па працы. «Сны праўдзяць», — упэўнена гавораць старыя людзі менавіта пра такія сны, бо на схіле веку адгадкі ўжо засьпелі іх: кожнага свае і кожнага — зьнянацку.

Ула. Рака. Я прысьніў яе напярэдадні Дзядоў. Быў пагодны залаты дзень і, праўдзіва, жнівеньскі, бо сонца, заліваючы сваім сьвятлом увесь абшар, было не падманлівым у дабротах, як у траўні-чэрвені, не задушліва-пякучым, як у ліпені, а ўжо стамлёным і ласкавым, сьпелым, што яблык пасьля Спасу, надзейным і мудрым, што стары дзед, які адной толькі прыязнай усьмешкай можа дарыць цеплыню.

Быў жнівеньскі дзень, і мы з таварышам ішлі левым берагам Улы. Бераг быў нязвыкла высокі і стромкі, як для невялікай ракі, з аголеным пясчаным схілам. Вузкая сьцежка вілася ля самага абрыву, і кожны няўклюдны крок спараджаў пясочных зьмеяў, якія незадаволена шыпелі на нас і лянотна перабіраліся ніжэй да вады, але праз імгненьне замі́ралі, каб ізноў зрабіцца нябачнымі чужому воку.

Мы ішлі адзін за адным, сьлед у сьлед, і практычна не размаўлялі. Ладаваныя цяжкімі пляцакамі зь нейкім экспэдыцыйным рыштункам, мы напружана мераліся хадою з плыньню ракі, а таму разглядалі яе моўчкі, як хоць і прыемную, але суперніцу. Ула ж несла сваю плынь так нетаропка і годна, як насілі свае вянкі маладыя крывіцкія князёўны. Аглядаючы свае ўладаньні, яна клапатліва абмывала ўсе водмелі, рабіла рэвэрансы вірам зь іх таемнымі насельнікамі, ветліва пасьміхалася сонцу, не зважаючы на нас.

Празрыстая зіхоткая вада, што змывала карэньне дрымучых лепельскіх лясоў, цешылася зь мядовых чашніцкіх лугавінаў, мела бурштынавы колер усіх магчымых адценьняў. Пры беразе й на водмелі — гэта была сьветапушчаная маладой сасной жывіца, на глыбіні — добра настоены ўзвар сьвятаяньніку. Блізкая й непадступная, Ула каторы раз вымярала сваю пуцявіну, мы ж, аглядаючы жывое хараство, моўчкі брылі за ёю.

Нечакана, за чарговым выгінам берагу, Ула раскацілася ўшыркі, разьлілася шырачэзным плёсам. Чамусьці менавіта цяпер стала зразумелым, што мы маем пільную патрэбу пераправіцца на другі бераг ракі. Мой спадарожны таварыш (ня памятаю ні ягонага твару, ні як гучаў голас) пачаў пераконваць мяне, што выканаць гэтую задачу лацьвей менавіта тут, на плёсе, дзе, маўляў, плытка і раку можна перайсьці, не замачыўшы валасоў. Чым болей слухаў яго, тым больш і больш сэрца маё поўнілася незразумелай трывогай ды страхам. Ула нібыта папярэджвала пра нешта, не дапускала, адштурхоўвала ад сябе. Вясёлкавая вада ўвадначас зрабілася пагрозьлівай і змрочнай. Я катэгарычна адмовіўся ад прапазыцыі, у выніку чаго выбухнула непрацяглая, але бурлівая спрэчка. Нарэшце мы пастанавілі на тым, што ён плыцьме тутака, я ж, прыхапіўшы ягоныя хатулі, пашыбую берагам да найбліжэйшага моста, што мусіў быць за пару кілямэтраў адгэтуль. Кожны крок даваўся цяперака ўдвая цяжэй, ды толькі нешта штурхала ў сьпіну, не давала азірнуцца. Чамусьці да празрыстага смутку стала ясна, што таварыша свайго я больш ніколі ня ўбачу, што не памахае ён мне пераможна і прыветна з правага берагу, што Ула забрала яго назаўжды.

Узабраўшыся на чарговую строму, я заўважыў чараду людзей, што нетаропка падымаліся мне насустрач з даліны. Дзень раптам перамяніўся, і замест россыпаў сонечнага сьвятла запанавала сутоньне зь нейкім дзіўнаватым шэра-малочным туманам. Усё наўкола страціла свае дакладныя і ясныя абрысы, выразнасьць фарбаў і стала расплывістым ды няпэўным, як бы вочы мае сталі слабыя, а я забыўся на акуляры.

Людзі набліжаліся, туман падымаўся разам зь імі. Колькі іх было — сказаць цяжка, дый палічыць іх было немагчыма: туман паказваў толькі першыя шэрагі. Ішлі яны павольна — мужчыны і жанчыны, дзеткі каля іх, а тыя, што зусім малыя, вісьлі на руках у сваіх мамак. Толькі вось дзеці ня плакалі, не гукалі бацькоў, а старэйшыя не дурэлі міжсобку, як гэта зазвычай бывае. Людзі ішлі моўчкі. Нібыта ахвяруючыся ў гонар нечага. Стала ніякавата, і я ліхаманкава прыдумляў годную прывітальную формулу, бо два дзяды, што вялі гэтых людзей, былі ўжо крокаў за дваццаць ад мяне. На языку круцілася абы-што, і, акрамя як «Дабрыдзень», у розум нічога ня лезла. Адзін зь іх, з густымі сіваватымі бровамі, у фрэнчы вайсковага пакрою, быў старэйшы за чарнявага, апранутага ў сьветлую кашулю, і чамусьці нёс у руках патухлы пчалярскі дымар. Абодва яны былі чыста голеныя, і недаўгія валасы былі старанна і акуратна зачасаныя. Калі яны падышлі зусім блізка, я з жахам усьвядоміў, што яны не маўчаць. Пачаргова варушыліся іхнія вусны, спакойная жэстыкуляцыя выдавала прыязную сяброўскую размову, ды толькі вушы мае ня чулі ані слоўца, ані гуку. Я павітаўся зь імі — каўкнуў, як рыбіна, ротам — і не пачуў уласнага голасу. Дзяды прайшлі паўз мяне, не заўважыўшы, не прыкмеціўшы, быццам месца, дзе я стаяў, было пустое. Гэткім самым чынам за імі пацягнуліся і астатнія, апранутыя ўсё болей у даматканае, некаторыя ў сьвітах і кажухах. Ішлі адвольна, без заўважнага парадку. Хто невялікімі купкамі, хто паасобку — усе ўзыходзілі на мой пагорак і зьнікалі з вачэй за сьпінаю, а павярнуцца і паглядзець ім усьлед я ня мог. Нібыта ледзяны прэнт усадзіў мне нехта між лапатак, каб ня збочыў, каб не варухнуўся.

На гэтым месцы стужка сну ліхаманкава закруцілася, у вачах усё замігцела, паплыло і нарэшце прапала. Карцінка ўзнавілася ўжо ў горадзе. Паліваны машынамі асфальт, дыхтоўныя ходнікі, шыкоўныя крамы і машыны, бляск рэклямы… Цалкам разгублены і агаломшаны, зь вялікім недарэчным пляцаком, у палявым, прапахлым лесам і вогнішчам убраньні й запыленых ботах, я лавіў на сабе грэблівыя позіркі модных паненак і стылёвых панічоў. І мне стала сорамна. А праз імгненьне стала пякуча сорамна за свой сорам і… я прачнуўся.

Вочы ўтаропіліся ў акно, дзе толькі-толькі пачынаў расплюшчваць вочы шэры кастрычніцкі ранак, а бачылі Улу, стромкі бераг, загадкавых падарожных. Сон значыў. Толькі што? Узгадаў Бачэйкава, колішняе родавае гняздо Цеханавецкіх, і Улу, што ахінала там старадаўні парк. Невялікая маляўнічая рэчка. Паратунак ад летняй сьпёкі. Вёска Жарнасекава, што непадалёк, і старажытны могільнік пад вялізнымі каржакаватымі соснамі, карані якіх агаліла Ула. Там пачалі класьці нябожчыкаў яшчэ крывічы, насыпаўшы курганы, потым — ліцьвіны, паставіўшы каменныя крыжы, цяперака — іх нашчадкі, стаўляючы пліты з мармуровай крошкі. Вада там у рацэ — чорная-чорная… Бо падманлівая ласкавасьць і бесклапотнасьць гэтае ракі. Амаль 440 гадоў таму абудзілася, прачнулася яна сярод самае зімы, каб да сьмерці апаліць сваёй сьцюдзёнай вадой нахабаў-прыхадняў з Усходу. І апаліла ажно дзесяць тысяч. Страшная тады была вада.

Я ляжаў і думаў пра сон, пакуль будзель пранізьліва не паклікаў мяне на працу. Сон і цяпер са мною. Сон-знак, сон-загадка. Бо ня можа проста так сьніцца рака, што век ад веку цячэ на Поўнач і поўніць сілай маё імя.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Бацька як брэнд

Пяць гадоў таму, калі бацька зваліў на Кубу, мы, журналісты «Навінак», файна сьцебануліся зь вядомага постэру з Чэ Геварам. Прымалявалі на фізіяномію камандантэ знаёмыя ўсім беларусам вусы і хітрыя вочы. Унізе напісалі «LukaCHEnko». Праз некалькі месяцаў у горадзе зьявіліся майкі з нашым «detournement». Да нашага жаху, бацька стаў брэндам.

Расейская фірма «Мэрліён» пайшла далей. Яна дадумалася выкарыстоўваць бацькаў вобраз для рэклямы ноўтбукаў «Dell». Паводле задумкі крэатараў фірмы, быў створаны кліп, дзе піпл у хакейным шлеме, на выгляд падобны да ППРБ, вызнае якасьць «Dell», канстатуючы: «Зь якасьцю амэрыканскіх кампутараў не паспрачаешся».

Тутэйшыя лібэралы ўспрынялі навіну як нейкі кур'ёз. Гы-гы.

Але брэнд — гэта болей чым тавар, гэта стыль, магчыма, беларускі стыль. Брэндынг Лукашэнкі можа быць калектыўнай трансцэндэнцыяй беларусаў. Паспрабуйце прымусіць аматара «Крыніцы» перайсьці на «Аліварыю», фаната «Дынама» — хварэць за «Гомель», і вы зразумееце, як цяжка будзе апазыцыйным палітыкам у 2006 г.

Аднак спачатку рэмарка: выпадак з «Мэрліён» яшчэ раз пацьвярджае тэзу Маркса аб абсалютнай амаральнасьці буржуінаў. Вось было б весела глядзець ролік «Мэрліён» у сям'і Завадзкага або Захаранкі. Вось бы пабеглі яны набываць гэтыя «Dell»! У гэтым пляне родная дыктатура куды паліткарэктнейшая. Не магу ўявіць сабе ў рэклямным блёку БТ, напрыклад, такі кліп: па Іраку едзе джып. Раптам з-за павароту выяжджае самазвал, набіты пад завязку шахідамі. Янкі спрабуе страляць з М16, але вінтоўка не фурычыць. Тады ён падбірае ў пяску калаш і мочыць тэрарыстаў, як Пуцін у сарціры. Пасьля глядзіць на маркіроўку і задуменна кажа: «Купляйце беларускае».

Тое, што бацька мае ў рэкляме антыпазытыўны вобраз, нічога ня кажа. Тыпаж антыгероя можа быць вельмі папулярны. Як раскручаны вобраз містэра зло, палкоўніка Бломфэльда з бандыяны, або паскуднага бізнэсоўца J.R. (актор Лары Хагман) з мэлядрамы «Далас»! Апошні, дарэчы, браў удзел у кампаніі рэспубліканцаў.

Але самае страшнае, калі для маладой генэрацыі спрацуе вядомы ў маркетынгу прыкол — «чым горш, тым лепей», калі аб'екты сьцёбу становяцца самымі папулярнымі прадуктамі. Клясычны выпадак апісаны ў Наамі Кляйн. У пачатку 90-х «Metro-Golden-Meyers» выпусьціла кіно «Showgirls» — абсалютна тупы эратычны фільм, які касава адразу праваліўся. Аднак праз некаторы час студыя пранюхала, што фільм нядрэнна разыходзіцца на касэтах. Прычым набываюць яго ня хворыя парнафілы, а прасунутая моладзь за дваццаць, тыя самыя bobos (багемная буржуазія). Яны зьбіраюцца на парці, глядзяць відэа і сьцябуцца з жудаснага сюжэту і сэксуальных кантактаў, якія адбываюцца падчас сэансаў аэробікі. «MGM» адразу зразумела, што трэба здымаць: налета на экраны выйшаў «Rocky Horror», які характарызавалі як «трыюмф абсалютна нізкапробнага кічу». Для прэм'еры нават нанялі гурму трансвэстытаў, якія бегалі па кіназалі, смакуючы самыя пошлыя моманты.

REUTERS

Прызнайцеся, хіба вы не атрымліваеце задавальненьня ад праглядаў сэлектарных нарадаў або разборкі палётаў па ўборцы азімых? Асабіста я проста пруся. Калі бацька выйдзе на выбары 2006 г. з абяцаньнем рабіць разносы чыноўнікам штовечар на БТ у рэжыме лайф, унутры, прызнаюся, нешта заварушыцца.

Беларусь паступова ператвараецца ў звычайную велізарную карпарацыю «Baćka limited». Ці не прыйшоў час апазыцыі пераходзіць да панкаўскай стратэгіі барацьбы з брэндамі — Do It Yourself?

Лёлік Ушкін,
левы радыкал

Каледжы міжнароднай супольнасьці

Беларускі камітэт каледжаў міжнароднай супольнасьці прабачаецца перад удзельнікамі конкурсу за непаразуменьні падчас падачы дакумэнтаў на адрас Таварыства беларускай мовы і паведамляе, што конкурс адбудзецца 23 красавіка 2004 г. па адрасе: Менск, вул. Рэвалюцыйная, 15, 2-і паверх (Цэнтар імя Ф.Скарыны). Пачатак аб 11-й.

У конкурсе могуць узяць удзел навучэнцы 10—11 клясаў. У каледжах выкарыстоўваецца сыстэма міжнароднай перадунівэрсытэцкай адукацыі IB (International Baccalaureate, Міжнародны бакаляўрэат). Дыплём IB дае права паступленьня ва ўнівэрсытэты многіх краін сьвету. Каледж у Вэнэсуэле дае спэцыяльнасьць «мэнэджмэнт у галіне фэрмэрства». Навучаньне вядзецца па-ангельску. Пераможцы конкурсу атрымаюць бясплатныя стыпэндыі ў каледжах Нарвэгіі ды Італіі, а таксама 75% аплаты стыпэндыі ў каледжы Вэнэсуэлы.

Галоўная мэта Каледжаў міжнароднай супольнасьці — усталяваньне ідэалаў міру, талерантнасьці і супрацоўніцтва паміж моладзьдзю розных краін праз адукацыю.

Музычныя стыпэндыі (струнныя інструмэнты: фартэпіяна, скрыпка, віялянчэль, чэла) прызначаюцца для асоб, якія выявілі выдатныя здольнасьці і маюць дасягненьні ў галіне музыкі.

Век абітурыентаў — 16—17 гадоў (16 гадоў павінна споўніцца да 1 верасьня 2004 г.). Век абітурыентаў Сельскагаспадарчага каледжу ў Вэнэсуэле — 18—22 гады, пажадана, каб яны былі сялянскага паходжаньня і мелі схільнасьці да сельскагаспадарчай працы.

Абітурыенты павінны мець пры сабе заяву з сваім адрасам, кантактным тэлефонам і нумарам школы, даведку аб стане здароўя, ліст паспяховасьці за мінулы і гэты навучальныя гады, характарыстыку, зьвесткі аб удзеле ў вучнёўскіх алімпіядах, мастацкай самадзейнасьці, спартовых сэкцыях, копіі грамат, дыплёмаў і г.д., а таксама падрыхтаваць твор на тэму «Ліст зь Беларусі» аб'ёмам ня больш за 4 старонкі вучнёўскага сшытка на беларускай ці ангельскай мовах.

Прэтэндэнты на музычныя стыпэндыі павінны падаць, акрамя названых матэрыялаў, відэакасэту з выкананьнем ня менш як дзьвюх музычных п'есаў агульнай працягласьцю да 10 хвілін, а таксама копіі дыплёмаў музычных конкурсаў.

Кантактны т.: 8-029-629-59-03.

Аргкамітэт конкурсу UWC

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Аўтарцы «Крыві сусьвету». Вы не разгледзелі ні чалавека, ні праблемаў яго творчасьці. Выйшаў беспраблемны панэгірык. «Я не паэтэса, я паэт» — так сябе ўпершыню называла не гераіня Вашага матэрыялу, а Ганна Ахматава.

Васілю Дз. з Рагуцішак. Літоўцы маюць распачаць пабудову трэцяга энэргаблёку ў Ігналіне, толькі ўжо паводле заходніх тэхналёгій, а закрыцьцё другога хацелі б адсунуць на 2019 г. і пра гэта вядуць адпаведныя перамовы з Эўракамісіяй. Іх падтрымліваюць Латвія ды Эстонія. Акурат на мінулым тыдні кіраўнік эстонскіх электрасетак Гунар Ок выступіў з адпаведнай заявай. На ягоную думку, закрыцьцё АЭС і адмова ад пабудовы трэцяга блёку прывядзе да энэргазалежнасьці Балтыі ад Расеі. Прыкладна тымі ж аргумэнтамі кіруюцца праектанты беларускай АЭС.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІНШАВАНЬНІ

Віншую «НН» і ўсіх беларусаў зь Вялікаднем. Хрыстос уваскрос! І Беларусь уваскрэсьне! Зьміцька

КАНТАКТЫ

Запрашаем штотыдзень у нядзелю а 14.00 да помніка Купалу на паэтычныя чытаньні. «Дзякуй тым, хто нашу мову родную ўскрашае!» Янка Купала

КНІГІ

Новыя, рэдкія ды антыкварныя кнігі, падручнікі, слоўнікі, кнігі для дзяцей, значкі, майкі, кераміка, аўдыё, відэа, CD на Румянцава, 13 (ТБМ) ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту. 13.00—19.30, апроч суботы ды нядзелі

«Навінкі-magazine» поштай! Замовы дасылаць на e-mail: alegmzr@tut.by

Куплю: М. «Le bon usage», «Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы», першы том Збору твораў Янкі Купалы, выданьні Я.Баршчэўскага, Я.Чачота, «Беларускія летапісы і хронікі» зь «Беларускага кнігазбору», Статут ВКЛ (перавыданьне 1989), 1-ы т. манаграфіі «Археалёгія Беларусі». Т.: 230-91-53

Кнігу Жанны Эрш «Філязофскае здумленьне» («ЭўраФорум», 1996) набуду. Т.: 238-95-96. Тацяна

Набуду беларускі лемантар (буквар). Дапамажэце! Т. у Віцебску 36-67-77, e-mail: zmic@tut.by. Зьміцер

ПРАЦА

Якасна выканаю пісьмовыя працы па беларускай мове, гісторыі і літаратуры. Зьвяртацца загадзя. Т.: 235-18-72 пасьля 17-й. Юрась

Магчымасьць атрымаць дадатковыя грошы настаўнікам, дактарам. Т.: 230-06-85. Сьвятлана

Студэнтка МДЛУ (нямецкая мова) шукае дадатковага заробку. Т.: 8-029-755-11-28. Алена

Праца для моладзі з 16 гадоў. Добры даход для тых, хто актыўны. Т.: 8-029-689-07-74.

Адказы на сканворд з № 14.

Па гарызанталі: Алесь. Го. Ода. Эра. Рум. Адукацыя. АК. Хаім. Нота. Пасаг. Тло. Га.

Па вэртыкалі: Атрад. Сорга. Одум. Акуліст. Абрыкос. Адхон. Кім. Цана. Сага. По.

Ключавое слова: Горад.

25 красавіка ў вандроўку
Легендарныя замкі Беларусі
Ліда—Наваградак—Мір—Нясьвіж.
Цана 18 тыс. руб. для дзяцей і 21 тыс. руб. для дарослых.
Даведкі праз т.: 222-88-76, 8-029-755-03-70
http://altusplus.narod.ru

30 красавіка — 3 траўня
запрашаем у вандроўку
«Залатая падкова Львоўшчыны»
Львоў—Жоўква—Крэхіў—Алеськ—Падгорцы—Менск
Кошт вандроўкі: для дарослых 45 у.а. + 15 000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. + 15 000 руб.
Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі 0,1 – 0,5 у.а.).
Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абодвух бацькоў.
Т.: 8-029-755-03-70, 222-88-76

Зь Беларусі – у Эўропу

Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў, што сёлета сканчаюць 7—9 клясы сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзамэнаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія.

Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.

Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў.

Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.

Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
фота-рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3526. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 14.04.2004.
Замова № 2251.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

Запрашаем на падарожжа **18 красавіка** (нядзеля) па маршруце **Менск — Глыбокае — Удзела — Мосар — гара Маяк — Слабодка — Браслаў — Опса — Відзы — Мядзел — Менск.** Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).